# Голас Радзімы

№ 50 (835)
Ліпень 1964 г.
Цана 2 кап.

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ

# КАМУНІЗМ — ГЭТА ЎСЕАГУЛЬНЫ ДАБРАБЫТ

Кожны раз, калі ў Маскве збіраецца чарговая сесія Вярхоўнага Савета СССР, да яе прыцягваецца ўвага ўсёй краіны. Маскоўскую хвалю ў такія дні ўзмоцнена ловяць радыёпрыёмнікі абодвух паўшар'яў зямлі. Але на гэты раз інтарэс да пасяджэнняў Савецкага парламента асаблівы.

Здавалася б, відавочных прычын для гэтага няма: ніякіх міжнародных пытанняў гэта сесія не вырашае. І тым не менш рэзананс, які яна атрымлівае ў свеце, велізарны. Гэта ўздзеянне простых і ясных, пераканаўчых і бясспрэчных фактаў сведчыць аб тым, што новая Праграма КПСС паспяхова пераўтвараецца ў жыццё. І пераўтвараецца яна не асобна, не толькі ў агульным народнагаспадарчым плане, а зусім канкрэтна і бясспрэчна адбіваецца ў паўсядзённым паляпшэнні жыцця савецкіх людзей.

Узяць, напрыклад, народную ахову здароўя. Яна сапраўды стала ў нашай краіне адным з асноўных клопатаў партыі і ўрада. Людское даўгалецце пастаўлена на павестку дня нашага жыцця як задача, якая вырашаецца не ў прыватным парадку — кожны сам за сябе,— а ў агульным агульнадзяржаўным, агульнанародным маштабе. Здароўе савецкага чалавека ахоўваецца як самы каштоўны набытак з першых гадзін нараджэння да глыбокай старасці, дні якой адсоўваюцца ўсё далей і далей.

Калі ў шырокім філасофскім плане паглядзець на праблемы, якія практычна, сугуба па-дзелавому абмяркоўваў у Крамлі Вярхоўны Савет СССР, дык нельга не ўспрыняць з радасным уздымам іменна гэтыя абставіны. Бо размова ідзе аб зусім відавочных кроках на шляху далейшага паляпшэння жыцця народа, аб беражлівым захаванні і пастаянным павелічэнні фізічных і духоўных сіл савецкіх людзей.

«Рост матэрыяльнай забяспечанасці народа, — гаварыў таварыш Хрушчоў на сумесным пасяджэнні абедзвюх палат, — умацаванне здароўя насельніцтва, павышэнне яго адукацыі і культуры, паляпшэнне бытавога абслугоўвання працоўных ствараюць умовы для ўздыму вытворчых сіл краіны, стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма. І чым энергічней будзем мы займацца ўсімі гэтымі праблемамі, больш паспяхова іх вырашаць, тым хутчэй сацыялізм пераможа ў эканамічным спаборніцтве з капіталізмам.

Увасабленню ў рэчаіснасць гэтай жыццелюбівай, а значыць і міралюбівай палітыкі і прысвечана цяпер уся паўсядзённая, нялёгкая, карпатлівая і ўпартая дзейнасць Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада. Мір арганічна патрэбен нам, каб з яшчэ большым размахам маглі б мы ажыццяўляць — раз за разам — буйныя сацыяльныя паляпшэнні.

На жыцці кожнай савецкай сям'і дабратворна адаб'юцца законы, якія прыме ў гэтыя дні наш парламент. Калі, у якія стагоддзі снілася селяніну, што ў старасці або ў выпадку хваробы, інваліднасці ён зможа разлічваць на дзяржаўную дапамогу, на сацыяльнае забеспячэнне? Гэта — прынцыпова новы падыход да працаўніка зямлі. А на колькіх сямейных бюджэтах прыкметна адаб'ецца павышэнне заработнай платы васемнаццацімільённай арміі работнікаў, якія абралі сваім жыццёвым полем дзейнасці сферу абслугоўвання.

Камунізм — гэта ўсеагульны дабрабыт, гэта высокі ўзровень жыцця, гэта багацце, а не ўсеагульная галеча, не аскетызм і адмаўленне людскіх, матэрыяльных і духоўных радасцей. Бадай, толькі па логіцы кітайскіх кіраўнікоў атрымліваецца, што калі народ у лапцях ходзіць і пустую капусту з агульнай міскі сёрбае — гэта камунізм, а калі працоўны чалавек жыве добра і хоча заўтра жыць яшчэ лепш — гэта амаль што рэстаўрацыя капіталізму.

Савецкія людзі, пераўтвараючы ў жыццё новую Праграму роднай Камуністычнай партыі, дабіваюцца ўсё новых поспехаў на цвёрда імі абраным шляху. Сесія Вярхоўнага Савета СССР падвяла вынікі таму, што ўжо дасянута, і намеціла новыя рэальна ажыццявімыя планы далейшага павышэння народнага дабрабыту.

Масква. Чацвертая сесія Вярхоўнага Савета СССР шостага склікання.
На здымку: у час пасяджэння.
Фота В. Севасцьянава і В. Собалева.

# ПРАГРАМА КПСС ПЕРАЎТВАРАЕЦЦА Ў ЖЫЦЦЁ

## ДАКЛАД М. С. ХРУШЧОВА НА IV СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і Савет Міністраў СССР, сказаў М. С. Хрушчоў, даручылі мне выступіць на гэтай сесіі Вярхоўнага Савета з дакладам «Аб мерах па выкананню Праграмы КПСС у галіне павышэння дабрабыту народа».

На разгляд сесіі ўносяцца прапановы: аб пенсіях і дапамогах калгаснікам і аб павышэнні заработнай платы работнікам асветы, аховы здароўя, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, гандлю, грамадскага харчавання і іншых галін народнай гаспадаркі, якія непасрэдна абслугоўваюць насельніцтва.

Сама пастаноўка гэтых жыццёва важных пытанняў у вышэйшым органе дзяржаўнай улады сведчыць аб тым, што партыя паслядоўна і настойліва ажыццяўляе Праграму КПСС у галіне ўмацавання эканамічнай магутнасці нашай сацыялістычнай Радзімы, павелічэння яе нацыянальнага багацця.

Наша партыя і ўрад лічаць сваім свяшчэнным абавязкам выконваць вялікі ленінскі запавет: усямерна развіваць сацыялістычную эканоміку і на яе аснове павышаць жыццёвы ўзровень і культуру працоўных.

У дакладзе характарызуецца паспяховы ход выканання важнейшых задач, намечаных партыйнай праграмай у галіне эканамічнага будаўніцтва і ўздыму матэрыяльнага дабрабыту народа.

У сацыялістычным грамадстве, адзначае М. С. Хрушчоў, развіццё прамысловасці, уздым сельскай гаспадаркі, навукова-тэхнічны прагрэс, жыллёва-бытавое будаўніцтва, развіццё культуры — усё накіравана на тое, каб зрабіць жыццё чалавека забяспечаным, стварыць умовы для росквіту ўсіх яго творчых сіл і здольнасцей.

Праўда, знаходзяцца людзі, якія называюць сябе марксістамі, якія лічаць паляпшэнне

(Заканчэнне на 2-й стар.)

## АНАСТАС ІВАНАВІЧ МІКАЯН

СТАРШЫНЯ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

Анастас Іванавіч Мікаян нарадзіўся 25 кастрычніка 1895 года ў сялібе Санаін Алавердскага раёна Арменіі ў сям'і рабочага-цесляра. Па нацыянальнасці армянін.

У 1915 годзе ўступіў у рады Камуністычнай партыі. Актыўны ўдзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і ўстанаўлення Савецкай улады ў Азербайджане.

З 1926 года А. І. Мікаян працуе ў Маскве. З 1926 года па 1930 год—народны камісар знешняга і ўнутранага гандлю СССР. З 1930 года—народны камісар забеспячэння СССР. З 1934 года па 1938 год—народны камісар харчовай прамысловасці СССР.

З 1937 года па 1946 год А. І. Мікаян быў намеснікам Старшыні Саўнаркома СССР і адначасова (з 1938 года па сакавік 1946 года) народным камісарам знешняга гандлю СССР. З 1946 года—намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР, адначасова (з 1946 года па 19[illegible] год)—міністр знешняга гандлю СССР і (з 1953 года) міністр гандлю СССР. З 1955 года—першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР.

У 1943 годзе за асаблівыя заслугі ў галіне пастаноўкі справы забеспячэння Чырвонай Арміі харчаваннем, гаручым і рэчамі ў цяжкіх умовах ваеннага часу Анастасу Іванавічу Мікаяну прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Узнагароджан чатырма ардэнамі Леніна і іншымі ардэнамі і медалямі.

# ПРАГРАМА КПСС ПЕРАЎТВАРАЕЦЦА Ў ЖЫЦЦЁ

(Пачатак на 1-й стар.)

ўмоў жыцця народа ў сацыялістычным грамадстве «абуржуазваннем». Проста дзіва, як можна дадумацца да падобных сцвярджэнняў. Для сапраўднага марксіста такая «мудрасць» незразумелая. У буржуазным грамадстве вытворчасць арганізоўваецца для атрымання прыбытку і ўзбагачэння невялікай групы эксплуататараў. Зусім іншая справа пры сацыялізме. Сацыялістычная вытворчасць ставіць сваёй мэтай рост дабрабыту ўсяго народа.

У дакладзе прыводзяцца яркія лічбы, якія паказваюць, як многа зроблена ў краіне, і асабліва за апошнія гады, для паляпшэння жыцця народа. Гаворка ідзе пра велізарнае павелічэнне грамадскіх фондаў спажывання, росце спажывання тавараў, у тым ліку і харчовых, пра вялікі размах жыллёвага будаўніцтва, пра павышэнне ўзроўню культуры і адукаванасці савецкага народа.

Цяпер, гаворыць М. С. Хрушчоў, Савецкі ўрад намераны ажыццявіць рад дадатковых мер па далейшаму павышэнню матэрыяльнага дабрабыту народа.

Прадстаўлены на разгляд гэтай сесіі праект Закону аб пенсіях і дапамогах прадугледжвае карэннае паляпшэнне справы сацыяльнага забеспячэння калгаснікаў. Гаворка ідзе аб узаконеным праве калгасніка на пенсію па старасці, па хваробе, пры страце кармільца, а таксама на розныя дапамогі.

Праект Закону мае на ўвазе стварэнне саюзнага фонду сацыяльнага забеспячэння калгаснікаў за кошт адлічэнняў калгасаў і штогадовых асігнаванняў па дзяржаўным бюджэце.

Па дадзеных Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення, колькасць калгаснікаў, якія будуць мець права на пенсію, складзе каля 6,5 мільёна чалавек. Расходы на выплату пенсій і дапамог, па арыенціровачных разліках, вызначаюцца прыкладна ў 1,3—1,4 мільярда рублёў у год. Для пакрыцця гэтых расходаў калгасы будуць адлічваць штогод прыкладна тры-чатыры працэнты ад сваіх даходаў, што складзе ў 1965 годзе каля 800 мільёнаў рублёў.

Пенсіі і дапамогі калгаснікам прадугледжваецца ўвесці з 1 студзеня 1965 года. Для стварэння неабходнага рэзерву сродкаў намячаецца правесці ў 1964 годзе адлічэнне з даходаў калгасаў у памеры двух працэнтаў, што складзе прыкладна 350 мільёнаў рублёў. Значная частка сродкаў на пенсіі і дапамогі калгаснікам будзе выдзелена з Дзяржаўнага бюджэту.

Сістэму пенсіённага забеспячэння калгаснікаў нам трэба звязаць са ступенню эканамічнага развіцця калгасаў, узроўнем іх вытворчасці, працоўным укладам калгаснікаў у развіццё і ўмацаванне грамадскай гаспадаркі, а таксама ўкладам калгаса ў агульнасаюзны фонд пенсіённага забеспячэння.

Трэба прама і шчыра сказаць усім калгаснікам, працягвае дакладчык, што пенсіённая палітыка Савецкай дзяржавы будзе накіравана на тое, каб і ў старасці заахвочваць тых, хто лепш працуе. Няхай кожны чалавек ведае, што калі ён добра працуе сёння, дык ён лепш будзе забяспечаны і ў старасці. Такі падыход да справы адпавядае інтарэсам калгаснікаў, інтарэсам усяго савецкага грамадства.

Якія асноўныя палажэнні праекта Закону? Прадугледжваецца ўвядзенне пенсіённага забеспячэння калгаснікам па старасці, інваліднасці, дзецям, якія страцілі кармільца, а таксама дапамог жанчынам-калгасніцам па цяжарнасці і родах.

Пенсіі калгаснікам па старасці маецца на ўвазе ўстанавіць: мужчынам, якія дасягнулі 65 гадоў, пры стажы работы не менш 25 гадоў, жанчынам — ад 60 гадоў, пры стажы работы не менш 20 гадоў. У працоўны стаж залічваецца праца ў іншых галінах народнай гаспадаркі і служба ў Савецкай Арміі.

Памер пенсіі па старасці прапануецца ўстанавіць у залежнасці ад заробку, а іменна: 50 працэнтаў з заробку да 50 рублёў у месяц, а з астатняй часткі заробку — 25 працэнтаў.

Вось тут, таварышы, узровень развіцця гаспадаркі і адаб'ецца на пенсіённым забеспячэнні калгаснікаў. У калгасе, дзе вышэйшы ўзровень вытворчасці прадукцыі, а значыць і вышэй заробкі калгаснікаў і адлічэнні ў пенсіённы фонд, будуць і больш высокія пенсіі.

Мінімальная пенсія па старасці ўстанаўліваецца 12 рублёў у месяц. Максімальны памер пенсіі намячаецца ў межах, якія ўстаноўлены для рабочых саўгасаў, гэта значыць, 102 рублі ў месяц.

Праектам Закону прадугледжваецца заахвочваць тых калгаснікаў, якія пасля назначэння пенсіі не пакідаюць працы ў калгасе. Калі калгаснік пасля назначэння яму пенсіі будзе працягваць працу, то незалежна ад памеру атрымліваемага заробку яму будзе выплачвацца ўстаноўленая пенсія. Пры гэтым, калі пасля назначэння пенсіі калгаснік будзе мець больш высокі заробак на працягу двух гадоў, то пенсія можа быць павышана адпаведна заробку. Гэта будзе стымуляваць актыўны ўдзел калгаснікаў у грамадскай вытворчасці, клікаць іх да больш прадукцыйнай працы.

Пенсіі калгаснікам маецца на ўвазе налічваць з сярэднемесячнага фактычнага заробку ў калгасе за любыя пяць гадоў узапар з апошніх пятнаццаці гадоў перад зваротам за пенсіяй.

Пенсіі па інваліднасці прапануецца ўстанавіць інвалідам першай і другой групы. Калі інваліднасць наступіла ў выніку калецтва на працы або прафесіянальнага захворвання, маецца на ўвазе пенсіі назначаць незалежна ад стажу работы. У тым выпадку, калі інваліднасць звязана з агульным захворваннем, для атрымання пенсіі патрабуецца стаж работы ад аднаго года да 20 год, у залежнасці ад ўзросту калгасніка, гэта значыць, гэтак жа сама, як гэта ўстаноўлена законам аб дзяржаўных пенсіях для рабочых і служачых.

Пры аднолькавым узросце жанчынам-калгасніцам пенсіі па інваліднасці прадугледжваецца назначаць пры меншым стажы работы ў параўнанні з мужчынамі. Напрыклад, для ўстанаўлення пенсіі па інваліднасці жанчыне ва ўзросце 53 гадоў патрабуецца 13 гадоў працоўнага стажу, а мужчыну ў гэтым узросце — 16 гадоў.

Памер пенсіі па інваліднасці мэтазгодна налічаць з фактычнага заробку калгасніка гэтак жа сама, як і пенсіі па старасці. Інвалідам I групы прапануецца ўстанавіць той жа памер пенсіі, што і пенсіянерам па старасці, а інвалідам II групы — некалькі ніжэй.

Пенсіі з выпадку страты кармільца прапануецца назначаць дзецям памёршых членаў калгаса, якія былі на яго ўтрыманні, калі яны не дасягнулі 16 гадоў (вучні — 18 гадоў), або з'яўляюцца інвалідамі I—II груп з дзяцінства. Памер пенсіі з выпадку страты кармільца ўстанаўліваецца ў залежнасці ад заробку кармільца і ад колькасці дзяцей.

Законам уводзяцца дапамогі жанчынам-калгасніцам па цяжарнасці і родах.

ЦК КПСС, Савет Міністраў СССР і ВЦСПС, гаворыць М. С. Хрушчоў, разгледзелі становішча з аплатай працы работнікаў сферы абслугоўвання і ўносяць прапановы аб павышэнні заработнай платы работнікам асветы, аховы здароўя, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, гандлю, грамадскага харчавання і іншых галін народнай гаспадаркі, якія звязаны з абслугоўваннем насельніцтва. На новыя ўмовы аплаты працы прадугледжваецца перавесці больш 18 мільёнаў чалавек.

У праекце Закону намячаецца павысіць заработную плату работнікаў асветы ў сярэднім на 25 працэнтаў, а для асобных катэгорый работнікаў, напрыклад, выхавацеляў дашкольных устаноў — у сярэднім амаль на 40 працэнтаў.

Заработная плата работнікам аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння, фізкультуры і спорту ўзрасце ў сярэднім на 23 працэнты; работнікам гандлю — у сярэднім на 15 працэнтаў; грамадскага харчавання — у сярэднім на 25 працэнтаў; работнікам жыллёва-камунальнай гаспадаркі і бытавога абслугоўвання — у сярэднім на 15 працэнтаў.

Цэнтральны Камітэт КПСС, Савет Міністраў СССР прызналі неабходным павысіць таксама заработную плату работнікам дзяржаўнага апарату на месцах.

Акрамя таго, будзе павышана на месцах заработная плата работнікаў пракуратуры і судовых органаў, планавых і статыстычных работнікаў, ашчадных кас, дзяржаўнага страхавання, матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, збыту, сістэмы нарыхтовак і некаторых іншых арганізацый.

Меры, якія прадпрыймаюцца па павышэнню заработнай платы, гаворыць М. С. Хрушчоў, гэта толькі першыя крокі. Каб здзейсніць новыя, яшчэ больш сур'ёзныя крокі па павышэнню дабрабыту народа, мы намецілі шляхі, якія садзейнічаюць больш хуткаму будаўніцтву матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, больш эфектыўнаму вядзенню гаспадаркі і хуткім тэмпам развіцця нашай эканомікі, паскарэнню вытворчасці ў дастатку прадуктаў харчавання, адзення, абутку і іншых тавараў шырокага ўжытку. Гэтыя шляхі былі намечаны на снежаньскім (1963 г.) і лютаўскім (1964 г.) Пленумах ЦК КПСС.

Хімізацыя народнай гаспадаркі і інтэнсіфікацыя сельскай гаспадаркі запатрабуюць вялікіх капітальных укладанняў, але правядзенне іх у жыццё паскорыць будаўніцтва матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма і створыць умовы для больш хуткага павышэння дабрабыту народа. Тым самым будзе забяспечана таварнымі рэсурсамі ўзрастаючая пакупная здольнасць насельніцтва, можна будзе зніжаць цэны на тавары, якія выпускаюцца лёгкай прамысловасцю.

Камуністычная партыя, савецкі народ, гаворыць у заключэнне М. С. Хрушчоў, змагаюцца за стварэнне багацця матэрыяльных і духоўных даброт у нашай краіне. І мы цвёрда верым, што створым яго, у нас будзе камуністычнае багацце. Але яно будзе дасягнута толькі на аснове вышэйшай прадукцыйнасці працы. Гэта і ёсць той ключ, якім мы адчынім дзверы ў камуністычнае грамадства. Камунізм можна пабудаваць працай, працай і толькі працай мільёнаў і мільёнаў рабочых, калгаснікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў, вучоных, дзеячоў народнай асветы і аховы здароўя, культуры, усіх работнікаў фізічнай і разумовай працы.

Яркі, вялікі даклад М. С. Хрушчова, які быў выслуханы з вялікай увагай, неаднаразова перапыняўся бурнымі апладысментамі прысутных.

ТАСС.

У Халопеніцкім універмагу.
Фота К. Якубовіча
і Л. Папковіча.

## Хроніка · Хроніка · Хроніка · Хроніка

Старшыня Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчоў накіраваў у Каір старшыні Другой Усеафрыканскай канферэнцыі кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў пасланне, у якім ад імя савецкага народа і ўрада горача вітае гэты форум незалежных афрыканскіх краін. У пасланні адзначаецца, што гэта сустрэча мае важнае значэнне не толькі для Афрыкі. Усе народы ўважліва сочаць за ходам гэтай канферэнцыі, якая можа ў многім садзейнічаць далейшаму развіццю нацыянальна-вызваленчай барацьбы. М. С. Хрушчоў піша, што Савецкі ўрад у сваіх адносінах з дзяржавамі Афрыкі строга і няўхільна праводзіць палітыку дружбы і раўнапраўнага супрацоўніцтва.

* * *

У РСФСР праходзяць дні беларускай літаратуры. Беларускія пасланцы П. Броўка, М. Танк, Р. Барадулін, Я. Скрыган, М. Калачынскі, П. Кавалёў і іншыя выступалі перад працаўнікамі ля вытокаў вялікага Енісея, у сяле Шушанскім, у гарадах Урала, на прадпрыемствах Масквы і Падмаскоўя. Пісьменнікі Беларусі пабывалі ў горадзе Гжацку на Смаленшчыне і сустракаліся з бацькамі касманаўта Юрыя Гагарына.

У час сустрэч з калгаснікамі, рабочымі і інтэлігенцыяй госці яшчэ раз пераканаліся ў тым, што творы беларускай літаратуры шырока вядомы ў РСФСР.

* * *

У выніку савецка-чэхаславацкіх перагавораў, якія працякалі ў духу брацкага супрацоўніцтва паміж абедзвюма краінамі, у Маскве падпісана пагадненне аб пастаўках з ЧССР у СССР камплектнага абсталявання прадпрыемстваў і ўстановак для хімічнай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці ў 1966—1970 гадах. Пагадненнем прадугледжваецца пастаўка звыш 80 сучасных камплектных прадпрыемстваў і 400 установак.

## ПАЭЗІЯ ЛІЧБАЎ І ФАКТАЎ

**1946 год — даў першую прадукцыю Мінскі мотавелазавод.**

**1947 год — выраблены першыя ў рэспубліцы 18 аўтамабіляў.**

**1950 год — на Мінскім трактарным заводзе сабраны першыя 36 трактараў.**

**1951 год — уступіў у строй Мінскі падшыпнікавы завод.**

**1957 год — асвоена першая тэхналагічная лінія на Мінскім заводзе аўтаматычных ліній.**

**1960 год — рэспубліка атрымала прыродны газ па газаправоду Дашава — Мінск.**

**1961 год — дала прамысловы ток першая чарга Бярозаўскай ДРЭС.**

**1963 год—з канвеера Мінскага трактарнага завода сыйшоў 300-тысячны трактар «Беларусь».**

**— У БССР было выпрацавана 5 мільярдаў 495 мільёнаў кілават-гадзін электраэнергіі, у 11 разоў больш, чым у 1940 годзе.**

**— У гэтым жа годзе далі першую прадукцыю гіганты беларускай хіміі — Салігорскі калійны камбінат, Гродзенскі азотнатукавы і Полацкі нафтаперапрацоўчы заводы.**

**У 1963 годзе аб'ём прамысловай вытворчасці ў рэспубліцы ў параўнанні з 1945 годам узрос у 29 разоў.**

**За апошнія 20 гадоў у Беларусі адноўлена і зноў пабудавана звыш 650 буйных прамысловых прадпрыемстваў.**

**Прадукцыя прамысловасці рэспублікі вывозіцца за межы СССР у 56 краін.**

**Беларускі аўтазавод у Жодзіна — адзінае ў краіне прадпрыемства, якое выпускае аўтатранспартныя сродкі грузападымальнасцю звыш 25 тон.**

**Цяпер з канвеера МТЗ кожныя 6 мінут сыходзіць трактар.**

**Аб'ём валавой прадукцыі хімічнай індустрыі ў БССР у наступным годзе павялічыцца ў 2,2 раза ў параўнанні з 1963 годам. Гэта значыць, што за два гады ў хімічнай прамысловасці рэспублікі будзе зроблена больш, чым за ўсе гады Савецкай улады.**

**Да канца сямігодкі Беларусь будзе даваць звыш 31 працэнта ўсёй агульнасаюзнай вытворчасці калійных угнаенняў.**

**За апошнія дзесяць гадоў валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі рэспублікі ўзрасла на 44 працэнты.**

**У 26 вну рэспублікі займаецца больш як 86 тысяч студэнтаў — у чатыры разы больш, чым у 1940 годзе.**

**Працоўных рэспублікі абслугоўвае звыш 7 тысяч масавых бібліятэк, больш як 5 тысяч клубаў, 4,5 тысячы кінаўстановак.**

# ДЛЯ МІЛЬЁНАЎ ПРАЦОЎНЫХ

**Сесія Вярхоўнага Савета СССР завяршыла сваю работу. У гэтыя дні да Маскоўскага Крамля была прыкавана ўвага ўсіх савецкіх людзей. Сесія разгледзела пытанні, якія маюць велізарнае значэнне для нашай краіны, для мільёнаў працоўных, і прыняла рад новых Законаў.**

***

У цяперашні час маецца магчымасць увесці больш устойлівую сістэму сацыяльнага забеспячэння ў калгасах шляхам устанаўлення пенсій па старасці, па інваліднасці, з выпадку страты кармільца і дапамогі для жанчын—членаў калгасаў па цяжарнасці і родах,—гаворыцца ў Законе «Аб пенсіях і дапамогах членам калгасаў».

Чым вышэй прадукцыйнасць працы калгаснікаў, тым больш калгас дае і прадае дзяржаве прадукцыі з гектара ворыва, чым вышэй яго даход і ўзровень адлічэнняў у пенсіённы фонд, тым больш павінны быць пенсіі калгаснікам. Лепш забяспечвацца павінны тыя калгаснікі, якія добра працуюць і ўносяць вялікі ўклад у грамадскую гаспадарку.

Выплата пенсій і дапамогі ў адпаведнасці з гэтым Законам забяспечваецца за лік сродкаў калгасаў і дзяржавы без усялякіх вылікаў з даходаў членаў калгасаў.

Права на пенсію па старасці маюць члены калгасаў:

мужчыны—па дасягненні 65 год і пры стажы працы не менш 25 год;

жанчыны—па дасягненні 60 год і пры стажы работы не менш 20 год.

Жанчыны—члены калгасаў, якія нарадзілі пяць або больш дзяцей і выхавалі іх да васьмігадовага ўзросту, маюць права на пенсію па старасці па дасягненні 55 год і пры стажы работы не менш 15 год.

Пенсіі па старасці членам калгасаў назначаюцца у размеры 50 працэнтаў з заработку да 50 рублёў у месяц, і, звыш таго, 25 працэнтаў з астатняга заработку.

Пенсіі па інваліднасці ў выніку працоўнага знявечання або прафесійнага захворвання членам калгасаў назначаюцца незалежна ад стажу работы.

Пенсіі па інваліднасці ў выніку агульнага захворвання або знявечання, не звязанага з работай, членам калгасаў назначаюцца з улікам стажу работы да часу звароту за пенсіяй.

Жанчыны—члены калгасаў, незалежна ад стажу работы, маюць права на атрыманне дапамогі за час водпуска па цяжарнасці і родах. Водпуск па цяжарнасці і родах даецца на 56 каляндарных дзён да родаў і 56 каляндарных дзён пасля родаў, а ў выпадку ненармальных родаў або нараджэння двух або больш дзяцей—на 70 каляндарных дзён пасля родаў.

Закон «Аб павышэнні заработнай платы работнікаў асветы, аховы здароўя, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, гандлю і грамадскага харчавання і іншых галін народнай гаспадаркі, якія непасрэдна абслугоўваюць насельніцтва», прадугледжвае ажыццявіць у 1964—1965 гадах павышэнне заработнай платы работнікаў галін народнай гаспадаркі ў сярэднім на 21 працэнт, у тым ліку работнікаў асветы ў сярэднім на 25 працэнтаў, аховы здароўя—на 23 працэнты, гандлю і грамадскага харчавання—на 18 працэнтаў і жыллёва-камунальнай гаспадаркі—на 15 працэнтаў.

***

**Усе прамовы дэпутатаў, якія выступілі з трыбуны сесіі, аб'ядноўвала агульная думка—Законы, якія абмяркоўваліся на сесіі,—яркае адлюстраванне клопатаў партыі аб савецкіх людзях.**



Торфапрадпрыемства «Смалявіцкае» — адно з перадавых у рэспубліцы.
На здымку: новыя торфаздабываючыя камбайны на тарфяных палях. Фота Г. Усламава.

## ВАС ШУКАЮЦЬ І ЧАКАЮЦЬ СВАЯКІ

БАБЛЯКА Пятра Фёдаравіча шукае бацька. Землякоў у Аўстраліі, якія ведаюць што-небудзь аб яго лёсе, просім паведаміць па адрасу: УССР, Львоўская вобласць, Яворaўскі раён., с. Новы Яр, Бабляку Фёдару Аляксеевічу.

НАШЫ ВЁСКІ І ГАРАДЫ

# МОЛЧАДЗЬ

У Молчадзі я быў у апошні раз неўзабаве пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Невясёлы выгляд мела тады вёска. Паўсюль былі відаць сляды разбурэнняў, але на папялішчах ужо ўзнімаліся новыя пабудовы.

І вось зноў мой журналісцкі лёс закінуў мяне ў гэтыя мясціны. Толькі цяпер я ехаў не на сялянскіх драбінах, як у той раз, а ў камфартабельным аўтобусе, які рэгулярна ходзіць з Баранавіч у Молчадзь...

У аўтобусе я разгаварыўся са сваім спадарожнікам.

— Куды едзеце? — спытаў ён.

— У калгас «Зара камунізма». Ведаеце?

— Я сам працую ў гэтым калгасе. Месяца паўтара назад запрасілі мяне ў праўленне калгаса, і наш старшыня Іван Рыгоравіч Канатопаў пытае ў мяне: «Як, Антон Ігнатавіч, адпачыць не хочаш?» А я і не ведаю, што адказаць... Стаю і маўчу. Старшыня ўсміхаецца і гаворыць: «Што ж, маўчанне — знак згоды. Выдзеліла табе праўленне калгаса путёўку на курорт у Сочы і грошы на праезд. Папрацаваў ты добра, з'ездзі адпачні...» 24 дні на Чарнаморскім узбярэжжы прабыў. А цяпер вось дадому вяртаюся...

Уперадзе паказалася цэлае мора агеньчыкаў.

— Вось і Молчадзь, — сказаў Антон Ігнатавіч Мечнік, так звалі майго спадарожніка.

А праз некалькі мінут аўтобус ужо ехаў па вуліцах вёскі. Па тратуарах спяшалася моладзь.

— У клуб ідуць, — прамовіў мой сусед. — У нашым палацы культуры канцэрты і спектаклі кожны тыдзень бываюць, а кіно — штодзень...

На аўтобусным прыпынку Антон Мечнік прапанаваў:

— Ды навошта вам гасцініца? Пойдзем да мяне.

За сталом Антон Ігнатавіч працягваў гаворку:

— Раней, пры Польшчы, нашу вёску называлі культурнай. А як жа іначай, — Мечнік іранічна ўсміхнуўся, — у Молчадзі ж была «інтэлігенцыя»— памешчыкі Валіцкі, Мяржыеўскі, войт Хрыстоўскі, зборшчыкі падаткаў, камендант, адзінаццаць паліцэйскіх, ксяндзы. А цяпер у нас зусім іншая інтэлігенцыя — нашы ж сяляне, калгаснікі.

Цяпер у кожнай вёсцы калгаса ёсць пачатковая або сямігадовая школа. А ў Молчадзі — дзесяцігодка, у якой вучыцца больш чым 800 дзяцей сялян. Працуюць ў школе 52 выкладчыкі. Дарэчы, у Молчадзі і іншых вёсках калгаса цяпер настаўнікаў працуе больш, чым іх было ва ўсім Баранавіцкім павеце да 1939 года.

Многа можна расказаць, як змянілася Молчадзь і іншыя вёскі калгаса. Але яшчэ больш змяніліся людзі. Многімі з іх ганарацца аднавяскоўцы. Мой спадарожнік — сын батрака Ігната Мечніка Антон — лепшы ў калгасе механізатар. Ды і не проста механізатар, а тэхнік-механік. Пры Савецкай уладзе атрымаў ён гэтую спецыяльнасць. Цяпер Антон Ігнатавіч кіруе ўсёй сельскагаспадарчай тэхнікай калгаса.

Ёсць дзе ў Молчадзі прымяніць людзям свае веды. У вёсках калгаса працуюць свае ўрачы, фармацэўты, настаўнікі, бухгалтары. Звыш ста пяцідзесяці чалавек сельскай інтэлігенцыі налічваецца тут.

Праз некалькі дзён я ад'язджаў з Молчадзі. Зноў аўтобус імчаў мяне па роўным прыгожым шасэ. Ехаў я і думаў аб тым, як змянілася аблічча вёскі за апошнія гады, якім багатым зместам напоўнена жыццё сялян.

Э. СІНІЦКІ.

## ПЕРАМОГА УЗБЕКСКІХ ЗЕМЛЯРОБАЎ

**Восенню мінулага года, калі ўся краіна рыхтавалася да снежаньскага Пленума Цэнтральнага Камітэта партыі, маладыя земляробы Узбекістана сабраліся ў Ташкенце, каб вызначыць свой уклад у хлебны каравай рэспублікі. Яны вырашылі разумна, па-гаспадарску выкарыстаць паліўныя землі, узняць усю сельскую моладзь на барацьбу за два ўраджаі ў год, за сто цэнтнераў збожжа з гектара.**

**Таварыш М. С. Хрушчоў цёпла прывітаў маладых узбекскіх земляробаў, іх важны пачын: «Моладзь Узбекістана пры вырашэнні цяжкіх і складаных задач не раз паказвала, што яна ўмее працаваць самааддана, памнажаць багацці нашай Радзімы, цвёрда трымаць сваё слова. Упэўнены, што так будзе і на гэты раз...»**

**Ва ўпартай працы прайшлі будні маладых хлебаробаў. І вось наступіла пара жніва. Большасць брыгад атрымала па 35, 40, 50 і больш цэнтнераў пшаніцы і ячменю з гектара.**

**Маладыя героі узбекскай зямлі, усяго 75 калгаснікаў, на плошчы 2 999 гектараў сабралі 127 637 цэнтнераў збожжа.**

## СЕГОДНЯ В НОМЕРЕ

**ДЛЯ ТЕХ, КТО НЕ УМЕЕТ ЧИТАТЬ ПО-БЕЛОРУССКИ**

В Москве, во Дворце съездов, завершила свою работу очередная сессия Верховного Совета СССР. Она рассмотрела вопрос о мерах по выполнению Программы КПСС в области повышения благосостояния народа и приняла ряд новых Законов — в частности, Закон «О пенсиях и пособиях колхозникам» и Закон «О повышении заработной платы работникам просвещения, здравоохранения, жилищно-коммунального хозяйства, торговли, общественного питания и других отраслей народного хозяйства, непосредственно обслуживающих население». Первый из них предусматривает коренное улучшение дела социального обеспечения колхозников. Второй — повышение заработной платы в среднем на 21 процент 18 миллионам советских трудящихся.

Наша партия и правительство, сказал в своем докладе на сессии Никита Сергеевич Хрущев, считают своей священной обязанностью выполнять великий ленинский завет: всемерно развивать социалистическую экономику и на ее основе повышать жизненный уровень и культуру трудящихся. Мы понимаем коммунизм как всеобщее благосостояние, высокий уровень жизни, изобилие продуктов.

О значении сессии, которая подвела итоги тому, что уже достигнуто, и наметила новые реально осуществимые планы дальнейшего повышения жизненного уровня советского народа, рассказывает передовая статья «Камунізм—гэта ўсеагульны дабрабыт». Сегодня мы также знакомим читателей с докладом Н. С. Хрущева («Аб мерах па выкананню Праграмы КПСС у галіне павышэння дабрабыту народа») и изложением принятых на сессии Законов.

На 4-й странице помещен отчет о посещении нашими канадскими гостями, членами ФРК, крупнейшего предприятия республики—Белорусского автомобильного завода. Туристы осмотрели его продукцию—известные всему миру могучие самосвалы, просторные светлые цехи завода, познакомились с бытом рабочих. Большой интерес вызвала у них работа местного отделения Общества «СССР—Канада». На стенде с фотографиями гости с радостью показывали друг другу знакомые города и пейзажи. Люди разных стран и континентов должны встречаться не на полях битвы, а за дружеским столом, на международных ярмарках, на олимпийских играх — к такому единодушному выводу пришли жодинские рабочие и канадские туристы.

На 5-й странице Е. Ситникова из Нью-Йорка в статье «На абноўленай зямлі» рассказывает о впечатлениях от поездки в родную деревню Гудовщину на Молодечненщине. С противоречивыми представлениями собиралась она в дорогу. «Но вот я побывала на Родине, — пишет Е. Ситникова,—и убедилась, что антисоветские пропагандисты нас бессовестно обманывают. Никакого голода, нехватки хлеба и в помине нет. Не только в городах, но и в сельских магазинах хлеба в достатке... Но главное, что меня удивило, — это спокойствие и какая-то непоколебимая уверенность людей в завтрашнем дне, их простота и искренние улыбки, хорошее настроение, полнота и радость жизни»...

Письмо об американском парадоксе—безработице и нищете в богатой стране Америке—прислал нам земляк Михась Родный. По данным опубликованного недавно исследования, сообщает он, 30 000 000 американцев живут в бедности и грязи в трущобах, иммигрантских рабочих лагерях и индейских резервациях. Автоматизация производства влечет безработицу. Бедняки страдают от отсутствия государственного здравоохранения.

Статья кандидата филологических наук И. Жидовича «Янка Купала і сусветная літаратура», помещенная на 6-й странице, рассказывает о всё возрастающей популярности классика белорусской литературы Янки Купалы за рубежом, о его влиянии на писателей братских народов.

О жизни современной белорусской деревни, о глубоких преобразованиях в ней за годы Советской власти пишут наши корреспонденты Э. Синицкий («Молчадзь», 3 стр.) и М. Лачимов («Адказ сыну», 7 стр.).

На 8-й странице помещена рецензия на книгу английского журналиста Алана Силлитоу «Дорога в Волгоград». Печатается на английском и белорусском языках.

# НЕ НА ПОЛІ БІТВЫ, А Ў СЯБРОЎСКАЙ БЯСЕДЗЕ

Члены дэлегацыі ФРК на Беларускім аўтамабільным заводзе.

Госці прайшлі па цэхах, убачылі самі, як робяцца магутныя «БелАЗы».

Дзяўчаты, якія працуюць у рэстаране, доўга разам з канадцамі пелі рускія і савецкія песні.

НА БЕЛАРУСКІМ аўтамабільным заводзе ў Жодзіна канадскую дэлегацыю сустрэлі песнямі і кветкамі. Дырэктар завода Іван Раманавіч Сідаровіч павёў гасцей па цэхах.

— Дык вось дзе ствараюцца магутныя беларускія волаты-самазвалы, аб якіх мы чулі ў Канадзе! Аб іх расказалі нашы таварышы, пабываўшыя раней нас у Беларусі, — гаварылі канадцы.

Далёка за мяжой ідзе слава аб жодзінскіх аўтамабілях. У дзесятках краін свету працуюць яны на будоўлях вялікіх і малых. Беларускі аўтазавод выпускае самыя вялікагрузныя машыны ў свеце. Даўно асвоен выпуск 25 і 27-тонных самазвалаў. Вяршыня, да якой імкнуцца тыя, хто стварае аўтамабілі на гэтым заводзе, — 110 тон. Трэба яшчэ адзначыць трываласць машын. Яны могуць прайсці без капітальнага рамонту да 80 тысяч кіламетраў.

Завод будуецца. Дэлегацыя пабывала там, дзе ўзводзяцца новыя цэхі. «Калі будаўніцтва завода будзе завершана, — гаворыць І. Р. Сідаровіч, — ён пачне выпускаць прадукцыі ў пяць разоў больш, павялічыцца амаль удвая колькасць рабочых».

Жодзіна зусім малады горад. Ён расце разам з заводам. У ім новыя вуліцы, новыя дамы, прыгожы белакаменны палац культуры. У гэты палац прыйшлі канадскія турысты пасля таго, як агледзелі завод. Яны бачылі вялікія глядзельныя залы, спартыўную залу, пакоі, дзе дзеці рабочых займаюцца жывапісам, музыкай, выпільваннем. Ёсць тут свой дзіцячы лялечны тэатр, які займае другое месца ў рэспубліцы. Ён часта выязджае ў суседнія школы, у вёскі, і ўсюды яго радасна сустракаюць.

— Таленты і здольнасці чалавека лепш за ўсё праяўляюцца ў дзіцячым узросце, — гаворыць М. Бурлакоў. — Тут, мне здаецца, кожнае дзіця можа паспрабаваць свае сілы ў любой справе, праявіць сваё ўменне.

— Хто ведае, можа сярод дзяцей, якія рабілі гэтыя малюнкі, — гаворыць М. Тарвік, аглядаючы выстаўку дзіцячых мастацкіх твораў, — ёсць будучыя вялікія беларускія мастакі.

Вядома, у нашай краіне не можа быць загубленых талентаў. Усё лепшае, што ёсць у дзецях беларускіх рабочых, абавязкова атрымае развіццё.

У вестыбюлі госці спыніліся ля стэнда «Знаёмцеся, Канада». Яны ўбачылі знаёмыя гарады, краявіды. Многія паказвалі месцы, дзе яны жывуць. Каля стэнда спыняецца Іван Раманавіч Сідаровіч. Ён расказвае, што на заводзе створана і ўжо некалькі год працуе мясцовае аддзяленне Таварыства «СССР — Канада». Сам Сідаровіч, старшыня гэтага аддзялення, у мінулым годзе летам з групай савецкіх спецыялістаў пабываў у Канадзе. Аказалася, што Магдуся Тарвік сустракалася з ім у Канадзе, і цяпер яна пазнала яго. Трэба сказаць, што сустрэча на беларускай зямлі была цёплай.

У Сідаровіча і канадцаў знайшлося многа агульных знаёмых. Іван Раманавіч добра ведае Акулевіча, Яснага, Папова. Ён спытаў, як яны жывуць, як здароўе, прасіў перадаць самае шчырае прывітанне. «Я шчасліва, што праз вас магу перадаць паклон маім канадскім сябрам». Пасля прыезду І. Р. Сідаровіча з Канады на заводзе быў вялікі сход. Дырэктар расказаў рабочым аб сваёй паездцы, аб Канадзе, аб яе людзях. А цяпер нашы госці паедуць дадому і таксама раскажуць аб усім, што яны бачылі ў Савецкім Саюзе. Вось так і ўмацоўваюцца сувязі паміж людзьмі розных краін, расце дружба.

Потым дэлегаты пабывалі ў бальніцы. Ім усім далі белыя халаты, правялі па ўсіх паверхах, паказалі аперацыйную. Кожную самую простую аперацыю робяць тры ўрачы, больш складаную — чатыры-пяць. Канадцы бачылі светлыя, чыстыя палаты для хворых, працэдурныя кабінеты, аптэку.

Пабывалі госці ў дзіцячым садзе-яслях. Тут быў якраз пасляабедзенны сон, усюды ціха, спакойна. Дзіцячыя ўстановы асабліва цікавяць гасцей, таму што там, дзе яны жывуць, такіх няма.

Бацькі, ідучы на работу, прыводзяць сваіх малышоў у сад. Тут у кожнай групе ёсць выхавацельніца і няня. Яны кормяць дзяцей тры разы ў дзень, укладваюць спаць, гуляюць з імі, чытаюць кніжкі. Дзеці не проста праводзяць час, іх тут выхоўваюць.

Мы ўжо казалі, што Жодзіна малады горад. Будаўніцтва яго яшчэ не скончылася. На праспекце Міру ўзводзяцца новыя шматпавярховыя жылыя дамы. Іх тут некалькі. Гэта значыць, што адразу дзвесцітрыста сем'яў рабочых атрымаюць новыя кватэры. Гасцей запрашаюць прайсці ў дом і паглядзець, як ён будуецца. Сямён Андрэевіч Шэйпа і Міхаіл Савельевіч Бурлакоў—цесляры. Яны асабліва прыдзірліва і ўважліва ўсё аглядаюць. Самой будоўляй застаюцца задаволеныя. «Зручна, трывала зроблена ўсё. У такой кватэры добра будзе жыць. Але вось аддзелачныя матэрыялы ў вас горшыя, чым у нас. Нягладка агаблёваны аконныя рамы». Магчыма, і ёсць некаторыя недаробкі ў нашых будаўнікоў. Але ж трэба ўзяць пад увагу тое, што Канадзе не патрэбна столькі жылля ў кароткі час, колькі патрэбна нам. З-за разбурэнняў, якія прынесла Беларусі Вялікая Айчынная вайна, мы да гэтага часу адчуваем недахоп жылой плошчы. У нас хутка растуць прамысловыя прадпрыемствы, пры іх — жылыя пасёлкі. Усе іншаземцы, якія прыязджаюць у нашу рэспубліку, гавораць, што яны нідзе не бачылі такіх тэмпаў і такога размаху будаўніцтва, як у Савецкім Саюзе. Наша галоўная мэта забяспечыць усіх людзей зручнымі, трывалымі, таннымі кватэрамі, а ўсе недахопы мы з часам абавязкова ліквідуем.

У новым рэстаране гасцей чакаў абед. За сталом, пасля чаркі гарэлкі, ажыўленай стала агульная размова, пачаліся тосты. З прамовай перад гасцямі выступіў Іван Раманавіч Сідаровіч:

— Вы прыехалі да нас у Беларусь. Вам цікава паглядзець, як жывуць вашы землякі. Што ж, глядзіце. Мы нічога ад вас не хаваем. Вы самі бачыце нашы перамогі, нашы поспехі. Напэўна, у нас, як і ва ўсякай іншай краіне, ёсць свае недахопы. Але мне хочацца расказаць аб тым, што бачыў я за мяжой, у капіталістычных краінах, калі я ездзіў туды, каб паглядзець, як працуюць нашы самазвалы. Я ніколі не думаў, што ў такіх страшэнных умовах могуць жыць людзі. Вялікія чэргі беспрацоўных за пахлёбкай. Людзі спяць проста на вуліцы, знясільваючая і малааплачваемая праца жанчын. Я бачыў чалавека, які ўсё жыццё цяжка працуе. І ў яго няма ніякай перспектывы.

Я раскажу вам пра сваё жыццё. Я нарадзіўся ў Заходняй Беларусі і да 1939 года жыў пад панскай Польшчай. Хапіла гора і на маю долю. У 1944 годзе, калі мне не было яшчэ і 17 год, я пайшоў у Савецкую Армію. Ваяваў. У 1951 годзе паступіў у вячэрнюю школу ў шосты клас. Працаваў на заводзе інжынерам - тэхнолагам але спецыяльнай адукацыі ў мяне не было. І вось за дванаццаць год з малапісьменнага юнака я стаў дырэктарам завода. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут завочна. Я гэта расказаў для таго, каб вы пераканаліся, што дабіцца поспехаў у нашай краіне можа кожны, было б толькі жаданне.

М. І. Макарэвіч усхваляванна гаворыць: «Прамова дырэктара Сідаровіча мне запомніцца на ўсё жыццё. З простага рабочага ён стаў дырэктарам. Чэсць і слава такому чалавеку».

— Але ў гэтым няма нічога асаблівага, — гаворыць Іван Раманавіч. — Гэта наша савецкая сістэма, наш лад даюць магчымасць кожнаму зрабіць тое, што зрабіў я.

Многа тостаў гучала ў той дзень за сталом: за дружбу, за свабодную Савецкую Радзіму за мір.

Сустракацца не на полі бітвы, а за сяброўскім сталом, на міжнародных ярмарках, на алімпійскіх гульнях — вось агульнае жаданне ўсіх людзей добрай волі.

*Д. ЧАРКАСАВА.*

# З УСМЕШКАЙ І КВЕТКАМІ

Раніцай 6 ліпеня канадскія турысты, якія прыехалі ў госці ў Савецкі Саюз па запрашэнню Беларускага таварыства па культурных сувязях з зарубежнымі краінамі, прыбылі ў Гомель. На вакзале грамадзян Канады сустракалі прадстаўнікі грамадскасці горада.

Ніхто з турыстаў не быў раней у Гомелі. Але муж Любы Чэчка— Пётр нарадзіўся тут. І калі Люба рыхтавалася да падарожжа па Савецкай Радзіме, ён даў ёй наказ:

— Абавязкова наведай мой Гомель, пагавары з яго жыхарамі і раскажы мне аб усім.

Што ж збіраецца расказаць мужу Люба Чэчка аб знаходжанні на Гомельшчыне?

— Я скажу, што Гомель— квітнеючы горад. Не верыцца нават, што ён зусім нядаўна ляжаў у руінах,—гаворыць Люба.—Я раскажу аб нашых незабыўных сустрэчах з землякамі Пятра.

Мы пабывалі ў гасцях у юных гамяльчан. Палац піянераў, які нам паказалі, зрабіў вялікае ўражанне. Дзеці займаюцца тут спортам, музыкай, балетам, наведваюць гурткі авіямадэліравання, геаграфічны, радыё, фота і многія іншыя. Сувеніры, якія паднеслі нам дзеці, мы будзем захоўваць усё жыццё.

Самым хвалюючым для ўсіх нас было прыняцце ў ганаровыя піянеры. Дзеці павязалі нам чырвоныя піянерскія гальштукі. Ці ж такое забываецца?

Мы былі на буйнейшым заводзе рэспублікі — «Гомсельмашы». Агледзеўшы гэта прадпрыемства, убачылі, як далёка пайшла прамысловасць рэспублікі. А тую цеплыню, з якой аднесліся да нас рабочыя, мы не забудзем ніколі...

Я скажу мужу, што не дарэмна ён ганарыцца сваёй Беларуссю і не дарэмна праз усё сваё жыццё пранёс у сэрцы любоў да роднай Гомельшчыны...

Канадскія госці пабывалі ў Палацы культуры чыгуначнікаў, у піянерскіх лагерах, у доме адпачынку «Чонкі», каталіся на катэрах па маляўнічаму Сожу, падоўгу размаўлялі з гамяльчанамі, цікавіліся іх жыццём. Усюды яны бачылі самы сардэчны прыём. Усюды іх сустракалі кветкамі і ўсмешкамі.

Пакідаючы гэты беларускі горад, госці ўвозілі з сабой самыя добрыя ўражанні.

**Г. ЕЎДАКІМАВА.**

Канадскія турысты ў Гомелі.

## Пішуць зямлякі

# НА АБНОЎЛЕНАЙ ЗЯМЛІ

*Цяжка ўсё гэта перадаць словамі—пачуцці, якія нахлынулі ад здзейсненай мары пабываць на Радзіме, пабачыць сваіх родных і знаёмых, ад незабыўных уражанняў пры сустрэчы з абноўленым родным краем.*

*З вельмі супрацьлеглымі ўяўленнямі збіралася я ў дарогу. Нам увесь час гаварылі, што, маўляў, у Расіі галадаюць, людзі сядзяць без хлеба і наогул жывуць вельмі дрэнна, бедна. Але вось я пабывала на Радзіме і пераканалася, што нас бессаромна ашукваюць. Ніякага голаду, недахопу хлеба і ў паміне няма. Не толькі ў гарадах, але і ў сельскіх магазінах хлеба ў дастатку, яго купляюць без усялякай чаргі. А хлеб які смачны, духмяны!*

*Пакідаючы Нью-Йорк, думала, што нідзе больш я не сустрэну падобнага горада. Так, падобнага не сустрэла, а ўбачыла яшчэ лепшы. Маю на ўвазе Маскву. Яна мяне скарыла прыгажосцю і велічнасцю, строгім парадкам і імклівым рухам, чысцінёй паветра, незвычайнай зеляніной вуліц і сквераў, цудоўным метро.*

*Нідзе я не ўбачыла страшэнных разбурэнняў вайны. Як быццам іх і не было. На месцы разбураных ушчэнт гарадоў выраслі новыя, яшчэ больш прыгожыя. Я пабывала ў Мінску і не пазнала яго. Прыгажун-горад раскінуў свае кварталы, праспекты, сады і паркі на многія кіламетры за былыя межы. Непазнавальна выраслі і адбудаваліся Маладзечна, Ашмяны і многія іншыя беларускія гарады.*

*Але галоўнае, што мяне здзівіла, дык гэта заспакоенасць і нейкая непарушная ўпэўненасць людзей у зайтрашнім дні, іх прастата і шчырыя ўсмешкі, бодры настрой. Усюды адчуваецца паўната і радасць жыцця. Узяць тую ж вёску Гудаўшчыну, дзе я правяла ў гасцях у сястры амаль два тыдні. Калгас, у якім яна працуе, гавораць, далёка не багаты і не перадавы. Але я бачыла поўны дастатак у кожнай сям'і. У многіх жыхароў ёсць радыёпрыёмнікі, матацыклы, паяўляюцца тэлевізары. Усе добра апранаюцца.*

*Я не магу не ўспомніць 1932 год, калі тут гаспадарылі польскія паны. Калі ўжо і было чаго ў дастатку, дык гэта крыжоў на дарогах. Добра памятаю, як хадзілі тады яшчэ босыя ў Барунскі касцёл — адзіную «культурную» ўстанову на ўсю акругу.*

*А цяпер я ўбачыла, як многа набудавана новага, як папрыгажэлі і да непазнавальнасці змяніліся вёскі: добрыя новыя дамы, вялікія каменныя грамадскія пабудовы. Не, тады так не будаваліся нават памешчыкі.*

*Праўда, як я ўжо гаварыла, заработкі калгаснікаў у гэтым калгасе яшчэ не высокія. Але, аказваецца, меркаваць аб жыццёвым узроўні савецкіх людзей толькі па заработку, як гэта прынята ў Амерыцы, нельга. Вельмі многае чалавек у Савецкім Саюзе атрымлівае бясплатна, з грамадскіх фондаў. Гэта перш за ўсё—бясплатная медыцынская дапамога, адукацыя і сацыяльнае забеспячэнне. Адной з такіх паслуг давялося карыстацца і мне: у горадзе Ашмяны мне бясплатна зрабілі аперацыю. У нас жа за гэта трэба было б заплаціць не меней 500 долараў. Ад усёй душы хочацца праз газету сардэчна падзякаваць урачу Віктару Максімавічу Грышкевічу і ўсяму персаналу бальніцы за чулыя і ўважлівыя адносіны да мяне. Парадак, чысціня ў бальніцы бездакорныя. Два разы ў дзень у палатах мыюць падлогу, праціраюць і без таго чыстыя вокны. Меню разнастайнае, як на курорце. І ўсё бясплатна!*

*Што ні кажы, а наша Амерыка тут вельмі далёка адстала. Калі захварэў чалавек і калі ў яго няма грошай, дык хоць памірай. Бо толькі ж адзін дзень знаходжання ў бальніцы абыходзіцца хвораму да 30—80 долараў. Прыпамінаю, як аднаму з нашых суайчыннікаў па прозвішчу Мазурык, (родам ён з-пад Мінска) патрэбна была аперацыя і стацыянарнае лячэнне. Ен сабраў каля шасці тысяч долараў. Аднак і гэтага яму не хапіла для поўнага курса лячэння.*

*Але затое нам, амерыканцам, адкрыт шырокі доступ у касцёлы, цэрквы і розныя малітоўныя дамы. Іх будаўніцтва, асабліва за апошнія гады, прыняло сапраўды небывалы размах. Рэлігійнымі ўстановамі і абшчынамі заняты ўсе раней пустыя падвалы Нью-Йорка.*

*Усе дзеці ў Савецкім Саюзе вучацца бясплатна. Многія выхадцы з маёй вёскі сталі ўрачамі, настаўнікамі, інжынерамі і спецыялістамі іншых прафесій. Ідуць раніцай дзеці ў школу чародкай, добра апранутыя, чысценькія. Дзяўчынкі-старшакласніцы не фарбуюцца, не кураць. З многімі я размаўляла па-англійску і атрымала вялікае задавальненне.*

*Так, многага дабілася Савецкая краіна, не толькі залячыла цяжкія раны вайны, але і далёка пайшла ўперад. Будучае—за ёю.*

*Іменна так думаюць простыя амерыканцы і тым больш суайчыннікі, якіх лёс закінуў далёка ад Радзімы. Зразумела, я не маю на ўвазе тых, хто зганьбіў сябе крывёю савецкіх людзей і, хаваючыся ад адказнасці, знайшоў сабе прыстанішча пад крылом імперыялістаў.*

*Ці можам мы, напрыклад, называць сваім суайчыннікам украінскага нацыяналіста па прозвішчу Варона? Родам ён з Палтавы. Зараз ён жыве ў Амерыцы, на людзях моліцца богу, лемантуе аб «вызваленні» і стварэнні «самасційнай Украіны». А ў больш вузкім коле хваліцца, як ён у гады нямецкай акупацыі ўласнаручна душыў бязвінных людзей, як аднаго рускага хлопца жывым утапіў у прыбіральні.*

*Але мы, простыя людзі Амерыкі, ведаем, што гэтыя прыхваснi не прадстаўляюць ні народаў Савецкага Саюза, ні амерыканскага народа. Мы ўпэўнены, што дружба і супрацоўніцтва двух вялікіх народаў павінны перамагчы.*

*Е. М. СІТНІКАВА.*

ЗША.

**Добра гуляць познім вечарам па гранітнай набярэжнай Свіслачы.**

Фота **Л. Папковіча.**

# ДУМКІ ЛЯЦЯЦЬ НА РАДЗІМУ

*Дарагія сябры на Радзіме. Кнігі, пасланыя вамі на мой адрас, атрымаў, за што вельмі дзякую. Паверце, што гэта вельмі дорага для чалавека, які знаходзіцца на чужыне. Калі чытаеш іх і часопіс «Огонек», у думках уносішся далёка на Радзіму і як быццам бачыш усё сваімі вачыма. Якія вялікія подзвігі здзяйсняе мой народ! Вось перада мною «Огонек» з фотаздымкамі, якія расказваюць аб савецкай дзяржаўнай дэлегацыі ў Егіпет на чале з М. С. Хрушчовым. З якой радасцю і гасціннасцю сустракаў егіпецкі народ савецкіх гасцей. Егіпцяне ўбачылі, на якія цуды здатны савецкія людзі, савецкі народ, і разумеюць, якое вялікае значэнне мае ў развіцці іх краіны дапамога СССР.*

*Дзякуючы савецкаму друку, абмену турыстамі мы, простыя людзі Канады, усё больш і больш даведваемся аб поспехах у Савецкім Саюзе. І хоць лёс закінуў нас далёка ад роднай зямлі, мы ад душы радуемся ўсім дасягненням на сваёй Радзіме.*

*Ваш сябра*

*А. ГРЫЦУК.*

Канада.

# НЕВЯСЁЛАЕ МАЁ ЖЫЦЦЁ

*Паважаныя работнікі рэдакцыі!*

*Шчыра дзякую за ваш падарунак — чатырнаццаць доўгаіграючых пласцінак з запісамі беларускай і рускай музыкі і савецкіх песень. Спяшаюся вам паведаміць, што я іх усе атрымаў і яны мне вельмі падабаюцца. І не толькі мне, але і ўсім маім знаёмым. Мы часта слухаем беларускія песні, частушкі, польку, а найбольш нам падабаюцца «Подмосковные вечера». Гэта песня славіцца на цэлы свет, яна перакладзена на англійскую мову, і яе часта на сваіх гулянках спяваюць англічане.*

*Не ведаю, чым і адплаціць вам за вашы клопаты. Я заўсёды хацеў мець пласцінкі з роднай музыкай, часта пытаўся іх у магазінах, але яны тут вельмі дорага каштуюць. А я просты рабочы, да таго ж інша-земец, ды і здароўе сваё страціў у час вайны. 11 чэрвеня 1942 года мяне вывезлі на прымусовыя работы ў Германію, там зведаў голад і холад, штрафлагеры і гумавыя дубінкі. Да гэтага часу я адчуваю боль у спіне, не магу працаваць на цяжкіх работах і не магу зарабляць столькі, колькі здаровы чалавек.*

*Шмат аб чым я мог бы вам напісаць, але, даруйце, не маю больш сіл. Толькі што прыйшоў з работы змучаны, заўтра вельмі рана ўставаць, і так ідуць мае дні і гады на чужыне. Старасць падыходзіць, нічога я тут не нажыў, і толькі смерць будзе маім збавеннем ад цяжкіх нягод.*

*Яшчэ раз дзякую вам і жадаю добрых поспехаў, шчасця і здароўя.*

*З прывітаннем і павагай Міхаіл Т.*

Англія.

# ДЗЯКУЮ ЗА КЛОПАТЫ

*Кнігі, пасланыя вамі, атрымаў. Атрымаў таксама пасылку з альбомам «На прасторах Беларусі». Шчырае дзякуй за гэтыя кнігі, чытанне якіх дастаўляе мне і маім сябрам вялікую прыемнасць. Мы даведаліся аб новых фактах гераічнай барацьбы нашага народа супраць фашысцкіх захопнікаў, аб тытанічным працоўным подзвігу ў пасляваенныя гады, аб вялікіх поспехах у цяперашні час.*

*Асаблівай увагі заслугоўвае кніга І. Майскага «Успаміны савецкага пасла». Знаёмячыся з гэтымі ўспамінамі, чытач даведваецца не толькі аб падзеях мінулага, але і вучыцца разгадваць каварныя замыслы ворагаў міру і дружбы паміж народамі.*

*З найлепшымі пажаданнямі.*

*Е. ЦІШКОЎ.*

Англія.

ЯКОЙ вам уяўляецца Амерыка?

Зямля дастатку, дзе аб'ядацца — найбольшая небяспека для здароўя?

Краіна магчымасцей, дзе кожны мае магчымасць выбіцца ў мільянеры?

Край, дзе сем'і маюць па дзве аўтамашыны, жывуць у люксавых кватэрах, выязджаюць у выхадныя дні на дачы, як толькі ім апрыкрыць роскаш горада?

Калі меркаваць па фільмах і тэлевізійных праграмах, якія выплываюць з амерыканскіх студый, гэта будзе дакладнае ўяўленне.

Але новае даследаванне, якое толькі што апублікавана, паказвае: адна шостая амерыканскага насельніцтва мае ўзровень жыцця ніжэй мінімальнага.

Згодна з афіцыяльнымі лічбамі, 30 000 000 мужчын, жанчын і дзяцей жывуць у бядоце і ў брудзе ў амерыканскіх трушчобах, іміграцкіх рабочых лагерах, бядняцкіх раёнах і ў індзейскіх рэзервацыях. Бядота, якая ў сваіх хатах не мае электрычнасці, поркаецца на звалках старых халадзільнікаў, каб ужываць іх для хавання ежы ад пацукоў. Кожны горад ад усходняга берага да заходняга мае свае трушчобы.

Век машын, аўтаматызацыя прынеслі гора працаўнікам. Звычайна было прынята думаць, што беднота — гэта пераважна негры і мулаты. Аказваецца, 57 з кожнай сотні — белыя, што жывуць у індустрыяльных мясцовасцях поўначы.

Шэсць чалавек з кожнай сотні — беспрацоўныя. Але нават і людзі з працай жывуць у беднасці — гэта дробныя фермеры.

Вынікі гэтай беднасці відавочны ў школах. У адной пачатковай школе Чыкага запісваюць па 1000 вучняў увосень. Большасць з іх пакідае школу на працягу года, бо бацькі іх былі выкінуты з кватэры, паехалі шукаць працы дзенебудзь у другім месцы, далучыцца да арміі вандроўных сезонных рабочых на фермах. Як сказаў адзін настаўнік: «Вельмі цяжка вучыць дзіця чамунебудзь у школе з 100-працэнтным абаротам у год». Бацькі вымушаны пасылаць дзяцей сваіх на работу ў поле. Паўмільёна дзяцей ад 10 да 15 год працуюць на фермах. 20 са 100 няшчасных выпадкаў на фермах бываюць з дзецьмі.

За апошнія 40 год 27 000 000 мужчын, жанчын і дзяцей з усіх галоўных правінцый — Нью-Йорк, Лос-Анжэлас, Філадэльфія, Дэтройт, Кліўленд, Вашынгтон — пакінулі сяло, каб знайсці сродкі для існавання ў горадзе.

Расказ аб амерыканскай беднаце можна падагуліць прыкладам Вілі Джонсана — шахцёра з Логан Сіці. Апошнюю працу Джонсан меў у 1954 годзе, калі 14 000 чалавек дабывалі вугаль з шахт. Цяпер там толькі 3 500 занята ў шахтах. Другой індустрыі не з'явілася, каб замяніць шахты і даць працу людзям, выкінутым з шахт. Джонсан, яго жонка і іх васьмёра дзяцей жывуць на 165 долараў у месяц, якія ён атрымлівае ад урада на ўтрыманне дзяцей. Яны гатуюць страву на вогнішчы на двары, каб сэканоміць электрычнасць, і пасылаюць дзяцей у школу ў разваленых чаравіках.

Другі прыклад. Эдмунд Макінтош выціскаў паўтара долара ў дзень, косячы мураўку ў багачоў. Цяпер яны пакуплялі маторныя касілкі і забаўляюцца гэтым самі.

Вельмі часта дактары адмаўляюцца лячыць беднякоў. Там няма дзяржаўнага забеспячэння здароўя.

Пакойны прэзідэнт Кенедзі прызнаваў гэтую праблему. Ен пісаў сенату ў красавіку 1963 года: «Беднасць сярод багацця ёсць парадокс, які не павінен застацца неатакаваным у гэтай краіне».

Не дзіва, што прэзідэнт Джонсан зрабіў атаку на амерыканскую беднасць галоўным пунктам сваёй праграмы.

**Міхась РОДНЫ.**

# Янка Купала
## І СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА

КУЛЬТУРА і МАСТАЦТВА

ТВОРЫ бессмяротнага беларускага песняра Янкі Купалы карыстаюцца выключнай павагай і папулярнасцю як сярод народаў СССР, так і перадавых людзей усяго свету. Аб усеагульным прызнанні іх у чытачоў нашай краіны красамоўна сведчаць лічбы: з 1917 па 1930 год толькі на мовах СССР выдадзена 129 купалаўскіх кніг агульным тыражом каля 5 мільёнаў экземпляраў.

Асабліва многа зрабілі ў справе папулярызацыі, перакладаў і выдання твораў паэта такія выдатныя майстры слова, як Максім Горкі, Валерый Брусаў, Сяргей Гарадзецкі, Міхаіл Ісакоўскі, Аляксандр Пракоф'еў, Паўло Тычына, Тэрэнь Масэнка, Антанас Венцлава, Ян Райніс, Андрэй Упіт, Уладзіслаў Бранеўскі і многія іншыя.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны творы паэта неаднаразова перавыдаваліся на роднай мове. У 1954 годзе Выдавецтва Акадэміі навук БССР завяршыла выданне шасцітомнага збору яго твораў. Да канца 1963 года гэта ж выдавецтва ажыццявіла выданне новага збору твораў паэта ў шасці тамах.

У 1935 годзе, выступаючы на міжнародным Парыжскім кангрэсе пісьменнікаў у абарону культуры, Якуб Колас адзначаў, што беларуская савецкая літаратура даўно пераадолела вузкія рамкі мясцовай абмежаванасці. Адным з першых прадстаўнікоў новай, маладой беларускай літаратуры быў прызнаны за мяжою іменна Янка Купала.

Польскі літаратар і перакладчык Ежы Енджэевіч, гаворачы аб месцы і ролі Купалы ў развіцці славянскіх літаратур, піша: «Янка Купала сваёй шчырай і самабытнай, а разам з тым і рамантычна ўзнёслай паэзіяй, блізкі нашаму Славацкаму, пяснярскай і грамадзянскай нотамі — Канапніцкай і Сыракомлі, рэвалюцыйным запалам — Бранеўскаму. Усіх гэтых паэтаў Купала выдатна перакладаў на мілагучную беларускую мову і тым самым выклікаў у нас да яго яшчэ большую ўдзячнасць».

Першыя пераклады Купалы з польскай мовы былі зроблены яшчэ ў 1905 годзе. Мы маем на ўвазе баладу Адама Міцкевіча «Тры Будрысы», якая ў свой час была перакладзена на рускую мову А. Пушкіным. Купалу належыць пераклад байкі А. Міцкевіча «Мужык і вужака», паэмы «Пані Твардоўская» і іншыя. Купалу-перакладчыка цікавіла і творчасць польскіх паэтаў-дэмакратаў — Уладзіслава Сыракомлі і Марыі Канапніцкай, якіх ён перакладаў і прысвяціў ім свае вершы.

Яшчэ ў дарэвалюцыйныя часы на старонках часопіса «Пшэглёнд краёвы», які выдаваўся ў Кіеве на польскай мове, творчасць паэта атрымала высокую ацэнку. «Яго паэтычныя творы, — гаворыцца ў артыкуле, — якія закранаюць многія сацыяльныя тэмы сучаснага жыцця, сведчаць аб выдатнейшых здольнасцях і арыгінальным самабытным і свежым таленце» (1909 г., № 3).

У буржуазна-шляхецкай Польшчы, нягледзячы на асабліва жорсткія ўмовы, ствараемыя афіцыяльнымі коламі, творы Янкі Купалы, Якуба Коласа і іншых савецкіх пісьменнікаў усё ж даходзілі да працоўных мас. Імя Купалы ўсё часцей з'яўлялася на старонках прагрэсіўных газет і часопісаў.

У народна-дэмакратычнай Польшчы творы выдатнага беларускага паэта Янкі Купалы сталі здабыткам прэгляд», які выдаваўся ў Празе. Гэты ж часопіс ў 1911 годзе змясціў вельмі папулярныя вершы паэта «А хто там ідзе?» і «Песня і сіла» ў перакладах Адольфа Чэрнага. У 1911 годзе ў газеце «Час» Адольф Чэрны выступіў з артыкулам «Беларускі нацыянальны і літаратурны рух у 1909—1910 гадах», дзе істотнае месца адвёў разгляду творчасці беларускага паэта. Аўтар пісаў, што паэзія Янкі Купалы з'яўляецца найбольш арыгінальнай, найбольш смелай і найбольш шматабяцаючай з'явай маладой беларускай паэзіі.

Пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі чэшска-беларускія літаратурныя сувязі пачынаюць пашырацца і ўзмацняцца. Значную ролю ў гэтым адыгралі паездкі Купалы ў Чэхаславакію ў 1925, 1927, 1935 гадах. У 1925 годзе Янка Купала разам з Цішкам Гартным і Міхасём Чаротам наведаў упершыню Чэхаславакію. Пражскі часопіс «Славянская кніга» неўзабаве змясціў артыкул, прысвечаны 20-годдзю літаратурнай дзейнасці Купалы, а «Славянскі прэгляд» апублікаваў у перакладзе на чэшскую мову вершы паэта «Брату-беларусу», «Цару неба і зямлі», «Мая вера», «Не шукай».

Асабліва шырокі водгук выклікаў прыезд Купалы ў Чэхаславакію ў 1927 годзе. У жнівеньскім нумары орган Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Чэхаславакіі газета «Рудэ право» паведамляла чэшскім чытачам аб прыездзе «вядомага беларускага паэта і пісьменніка Янкі Купалы на лячэнне ў Карлавы Вары» і змясціла артыкул аб яго жыццёвым і творчым шляху. Янка Купала, — гаворыцца ў артыкуле, — мае для беларусаў тое ж значэнне, што і Тарас Шаўчэнка для украінцаў, Міцкевіч для палякаў, Пушкін для рускіх.

У пачатку кастрычніка 1935 года Я. Купала разам з А. Фадзеевым, А. Талстым, А. Караваевай і іншымі пісьменнікамі зноў наведаў Чэхаславакію. У Пражскім універсітэце ён выступіў з чытаннем сваіх вершаў.

Шырокае народнае прызнанне творы Я. Купалы атрымалі ў народна-дэмакратычнай Чэхаславакіі. У анталогіі «Паэты Беларусі», выдадзенай у 1955 годзе, былі змешчаны лепшыя вершы паэта: «Мужык», «А хто там ідзе?», «Хлопчык і лётчык», «Беларускім партызанам» і іншыя.

Чытачам Кітайскай Народнай Рэспублікі добра вядома імя Янкі Купалы. У 1954, а затым у 1957 годзе выйшаў вялікім тыражом зборнік вершаў паэта «Жалейка». У 1958 годзе ў Пекіне выдана паэма «Над ракою Арэсай». Янка Купала ўспрыймаецца працоўнымі Кітая як класік сусветнай рэвалюцыйнай паэзіі.

Творы Я. Купалы ў Карэйскай Народнай Рэспубліцы былі змешчаны ў двухтомным выданні «Выбраныя творы савецкіх паэтаў», якое выйшла ў Пхеньяне ў 1955 годзе.

На венгерскай мове творы Я. Купалы друкаваліся ў перыядычным друку і асобных зборніках, выдадзеных у Будапешце: «Вершы савецкіх паэтаў» (1951 год), «Выбраныя мастацкія пераклады» (1952 год), «Анталогія савецкай паэзіі» (1952 год). У анталогіі, складзенай Анатолем Гідашам і Сяргеем Кір'янавым, змешчаны вершы: «Я не паэта», «Арлянятам», «Лён», «Дзень добры, Масква» і інш.

У 1954 годзе ў Бухарэсце выйшаў зборнік Я. Купалы «Выбраныя творы» на румынскай мове.

Творы Я. Купалы вядомы і балгарскім чытачам. Выдатныя вершы «Беларускім партызанам», «Паўстаў народ» былі змешчаны ў зборніку «Паэзія перамогі», выдадзеным у 1955 годзе, а такія, як «Я не паэта», «Хвалююцца морскія хвалі», «К сонцу» ў кнізе «Славянскія паэты», складзенай Л. Стаянавым і выдадзенай у Сафіі ў 1957 годзе.

Папулярнасць паэзіі Купалы за рубяжом расце з кожным годам. З ёю знаёмяцца амерыканцы, французы, італьянцы, аглічане, немцы.

У 1955 годзе ў Парыжы выйшла цікавая праца вядомага французскага пісьменніка лаўрэата Міжнароднай Ленінскай прэміі міру Луі Арагона. Асобны раздзел яе прысвечаны беларускай савецкай літаратуры і яе заснавальнікам Янку Купалу і Якубу Коласу. Аўтар падкрэслівае, што беларускія народныя пісьменнікі прыцягнулі ўвагу шматлікіх чытачоў сваёй народнасцю і прастатой.

Італьянскі даследчык Дж. Месіна ў кнізе «Беларуская літаратура», якая з'явілася ў свет ў 1952 годзе ў Фларэнцыі, прысвяціў асобны раздзел творчасці Я. Купалы.

Творы Янкі Купалы таксама выдаваліся ў Маскве выдавецтвам літаратуры на замежных мовах (на англійскай, нямецкай, французскай і іспанскай).

З кожным годам народы свету ўсё з большай павагай ставяцца да літаратурнай спадчыны Янкі Купалы. Яна трывала ўвайшла ў скарбніцу сусветнай культуры.

**І. ЖЫДОВІЧ,**
**кандыдат філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік літаратурнага музея Янкі Купалы.**

**Венгерскі танец у выкананні народнага ансамбля танца Мінскага трактарнага завода.**

Фота **Ул. Крука.**

# Забойца 300 000 чалавек перад мюнхенскім судом

Паўтара года назад мы апублікавалі фатаграфію: вядомы кат Гімлер і яго падручны — генерал СС Карл Вольф удзельнічаюць у масавым расстрэле мірных жыхароў у раёне Мінска. Карціна, да якой прыглядаўся Гімлер, была такая жахлівая, што нават яму самому стала млосна. Карл Вольф быў мацнейшы—ён прапанаваў сваю дапамогу райхсфюрэру СС.

Праз 20 год пасля гэтых страшэнных злачынстваў іх «аўтар», былы генерал СС, обергрупенфюрэр Карл Вольф стаў, нарэшце, перад судом прысяжных Мюнхена.

Абвінавачваемаму цяпер 64 гады. Да арышту яму жылося цудоўна—ён выдаваў кнігі (страшна падумаць, чаму ён мог навучыць моладзь), і яго выдавецтва давала добры даход. Карл Вольф, якога некалі кіраўнікі СС клікалі «Вольфхен» (Ваўчок), цяпер сівы, мацёры воўк, быў уласнікам адной з прыгажэйшых віл на беразе возера Штарнбергер каля Мюнхена. О, ён не мог паскардзіцца на жыццё ў Бонскай дзяржаве! Можа, ніхто не ведаў яго «подзвігаў» у час вайны? Можа, Вольф хаваўся пад чужым прозвішчам? Не! Яго крывавы шлях у Боне добра ведалі.

Карл Вольф быў доўгія гады начальнікам асабістага штаба Гімлера. Да восені 1943 года выконваў абавязкі сувязнога афіцэра Гімлера пры Гітлеры. Ён удзельнічаў у планаванні і ажыццяўленні «канчатковага рашэння яўрэйскай праблемы». Асабліва лютаваў на тэрыторыі Польшчы (у канцлагерах Трэблінка, Бельжац, Салібож) і на землях Беларусі.

Калі ў Італіі захістаўся ўрад Мусаліні, Гітлер паслаў Вольфа ў Рым з заданнем устанавіць над Мусаліні палітычны нагляд. Важнай птушкай быў некалі Вольф!

У лютым 1945 года ён наладжвае кантакты з кіраўніком амерыканскай стратэгічнай разведкі Аленам Далесам і прапануе яму капітуляцыю нямецкай арміі «Поўдзень». У сакавіку і красавіку 1945 года ён вядзе перагаворы на гэтую тэму з Далесам, генераламі Лемніцарам і Айрэй. 27 красавіка 1945 года перагаворы ўвянчаліся поспехам—Вольф адкупіўся капітуляцыяй сваіх войск у Італіі.

Арыштаваны пасля вайны, ён у жніўні 1949 года быў выпушчаны з турмы і ўзяўся за выдавецкую дзейнасць.

Падручны Гітлера і Гімлера пачаў ідэалагічную апрацоўку насельніцтва Заходняй Германіі, і яму доўгія гады дазвалялі гэта рабіць.

Нават і цяпер, калі пачаўся суд (дарэчы сказаць, арышт Вольфа выклікаў сенсацыю ў палітычных кругах ФРГ), Вольф не траціць веры ў сваіх сённяшніх гаспадароў. На пытанне старшыні суда, ці прызнае ён сябе віноўным, Вольф голасна, нават з какецтвам усклікае:

— Ну, што вы! Я не вінаваты!

Ён стараецца прадставіць сябе «гуманістам і ідэалістам», добрай воляй і чыстымі імкненнямі якога злоўжывалі. «Усё, у чым мяне абвінавачваюць, — заяўляе былы генерал СС, — мела месца без маёй волі, без майго ведама і ўдзелу».

Ён вымушаны прызнацца, што быў расістам, але тут жа дадае, што «разумеў расізм у пазітыўнай форме». Ён сцвярджае, што «не меў паняцця» аб тым, да чаго можа прывесці антысеміцкая істэрыя, і лічыў яе «толькі прапагандай».

Паслухай Вольфа, дык ён нявінная авечка; ён нічога не чуў, не бачыў і не рабіў.

Суд працягваецца. Будзе заслухана каля 70 сведак. Сярод іх—многія вышэйшыя чыноўнікі апарата Гімлера, відныя эсэсаўцы: генерал СС Бах-Зэлеўскі, начальнік Варшаўскага гестапа Хан, міністр бяспекі ва ўрадзе Франка Копе і іншыя. Большасць гэткіх сведкаў карыстаюцца свабодай.

Воран ворану вока не выдзеўбе!

**А. ВАСІЛЕНКА.**

## ПЛАНЕТА ЗА ТЫДЗЕНЬ

«Марыца — Усход-1» — буйнейшая ў Балгарыі. Барнаульскі кацельны завод паставіў для яе 18 паравых катлоў агульнай прадукцыйнасцю больш 3 тысяч тон пару ў гадзіну.

Прэзідыум Народнага сходу Балгарыі высока ацаніў дапамогу алтайскіх котлабудаўнікоў: Барнаульскі кацельны завод узнагароджан залатым ордэнам «Чырвоны Сцяг Працы». Надзвычайны і паўнамоцны пасол Балгарыі ў СССР Стаян Караджаў днямі прымацаваў да аксамітнага сцяга Барнаульскага кацельнага завода ордэн сваёй краіны.

* * *

Вось ужо некалькі дзён у Алжыры знаходзяцца савецкія студэнты-добраахвотнікі, якія прыбылі сюды для аднаўлення разбураных каланізатарамі вёсак у Кабіліі.

* * *

Канцылярыя прэзідэнта Рэспублікі Конга з цэнтрам у Леапольдвілі аб'явіла аб вызваленні з-пад варты віднага патрыёта Конга, актыўнага змагара за незалежнасць краіны Антуана Гізенгі.

Кангалезская рэакцыя без суда і следства пазбавіла Гізенгу дэпутацкіх паўнамоцтваў, арыштавала яго і саслала ў зняволенне на пустынны астравок Балабемба, дзе ён знаходзіўся больш 2-х з палавінай год. Уся сусветная грамадскасць дабілася вызвалення Антуана Гізенгі.

* * *

Знаходжанне дэлегацыі Вярхоўнага Савета СССР у Мангольскай Народнай Рэспубліцы праходзіць у абстаноўцы брацкай дружбы і гасціннасці. Савецкія парламентарыі сустракаюцца ў гэтыя дні з рабочымі, аратымі і прадстаўнікамі мангольскай інтэлігенцыі ў гарадах і аймаках.

У Мінску адкрылася выстаўка прыборабудавання і сродкаў аўтаматыкі венгерскага знешнегандлёвага прадпрыемства «Метрымпэкс». На выстаўцы экспануюцца прыборы для розных галін народнай гаспадаркі, у тым ліку прыборы тэхнікі, сувязі, атамнай фізікі, электрычныя, медыцынскія і геадэфізічныя прыборы, лабараторнае абсталяванне, прыборы для выпрабавання матэрыялаў і сродкаў аўтаматыкі.

На здымку: у зале выстаўкі.

Фота І. Змітровіча.

# ГАСПАДАР СВАЙГО ЛЁСУ

Ужо даўно прабіла пяць гадзін, Люба накрыла стол, а мужа ўсё не было.

— І куды ён прапаў? —трывожна думала яна. — Ніколі не здаралася, каб Павел спазняўся.

— Воленька, збегай на вуліцу, паглядзі, мо' бацька ідзе,— у які раз прасіла Люба дачку.

Але вось дзверы шырокэ расчыніліся, і на парозе з пакункамі ў руках з'явіўся Павел.

— Што ж ты так... Хіба забыўся, што сёння дзень нараджэння сына, — дакарала Люба мужа.

— Не забыўся, Любанька, не забыўся, але ў мяне сёння яшчэ адно свята. Вось бачыш, — і ён працягнуў маленькі скрутак.

— Фотаапарат, фотаапарат,— запрыгала Воленька, і ўся зазяяла радасцю.

— А гэта табе, жонка. Трымай 100 рублёў. Мая прэмія.

— Што ж гэта... — выціраючы слёзы, гаварыла Люба.

— Вось табе на, — супакойваючы, мякка гаварыў Павел.

— Дык я ж ад радасці, — казала жонка.

Павел сам, калі яму ўручалі гэтую прэмію, ледзь стрымліваў слёзы радасці.

Прэмія за яго працу. Узоры мэблі, якія ён распрацаваў, экспанаваліся на Усесаюзнай мэблевай выстаўцы. Ці гэта не гонар! І Кашура ўспомніў сваю майстэрню ў Аргенціне. Яна толькі называлася майстэрняй. Працаваў без адпачынку. Ледзь канцы з канцамі зводзілі.

Цяпер ён і ўласнай майстэрні не мае, а жыве ў многа разоў лепш. Кожны год водпуск яму аплочваюць, ды яшчэ пуцёўку бясплатную ў дом адпачынку даюць. Заўтрашні дзень не палохае Паўла — ён сам гаспадар свайго лёсу. А калі яму спатрэбіцца дапамога, сябры заўсёды працягнуць яму руку.

Многа надзей было ў сям'і Кашураў, калі 22 гады назад яны ад'язджалі ў Аргенціну з панскай Польшчы. Кашуры марылі набыць кавалак зямлі, разбагацець і абавязкова вярнуцца на Бацькаўшчыну. Багацця не набылі. Стары Кашура памёр на чужыне. Дзеці вярталіся на Радзіму па адным. Спачатку Іван, а потым і Павел.

Здаецца, зусім нядаўна гэта было: рашэнне вярнуцца на Радзіму, хваляванні, трывогі. А вось ужо тры гады Павел з сям'ёй жыве ў Мінску. На Радзіме нарадзіўся сын. Да гэтага часу Люба не можа забыць маскоўскую бальніцу і тое, з якой чуласцю і любоўю да яе там адносіліся. Не можа Люба нарадавацца і на сваю кватэру.

Павел працуе ў эксперыментальных майстэрнях Упраўлення лясной прамысловасці. Ён ужо пераканаўся, што на савецкіх прадпрыемствах усё робіцца, каб аблегчыць працу рабочага: і 7-гадзінны дзень, і розныя машыны, якія выконваюць усе працаёмкія працэсы. І адносіны да рабочага чалавека тут зусім іншыя, чым на Захадзе.

Воленьцы, якая нарадзілася ў Аргенціне, таксама спадабалася на новай Радзіме. Ёй падабаецца школа, у якой яна вучыцца, дзяўчынкі, з якімі яна сябруе. У яе многа сяброўак. Яна вывучыла многа вершаў савецкіх паэтаў, песень. Асабліва ёй падабаецца песня «Пусть всегда будет солнце!».

Гэта песня падабаецца не толькі Воленьцы. Яе спяваюць на ўсім зямным шары.

Усе сумленныя людзі зямлі за тое, каб заўсёды было сонца, каб над галовамі дзяцей свету было чыстае блакітнае неба.

**С. ЗАЛІВАКА.**

## ПОЎНЫ ПРАВАЛ ТЫДНЯ ПАНЯВОЛЕНЫХ НАРОДАЎ

**Правядзенне ў гэтым годзе ў Нью-Йорку аперэтачнага «тыдня паняволеных народаў» было, напэўна, самым вялікім прапагандысцкім паражэннем з моманту прыняцця пастановы па гэтай справе ў кангрэсе ў 1959 годзе.**

**«Урачыстасці» абмежаваліся беззмястоўнай паспешлівай цырымоніяй у ратушы, дзе мэр горада Вагнер прачытаў кароткую прамову, якая складалася з агульных фраз аб «патрэбе вольнасці для ўсіх». Апрача таго, былі прыспушчаны да палавы дрэўка сцягі 9 краін Усходняй Еўропы насупраць будынка ААН, што сабрала ў суме... 11 прахожых.**

# ПАРТЫЗАНСКІ РАЗВЕДЧЫК ПОЛЬ МЕЙО

СНЕЖАНЬ 1943 года. Па шасэ Мінск—Магілёў рухаецца конны абоз. На адзін з участкаў цэнтральнага фронту едуць сабраныя па татальнай мабілізацыі гітлераўскія ваякі.

Ухутаныя з галавой у коўдры і жаночыя хусткі, гітлераўцы баязліва азіраюцца па баках. Іх папярэдзілі: шлях на Бялынічы небяспечны, партызанская зона.

Лес загаварыў у зусім нечаканым месцы, загаварыў мовай партызанскіх аўтаматаў.

Бою, па сутнасці, не было. Немцы не паспелі разабрацца, хто і адкуль страляе, як усё было скончана. Партызаны аглядалі снежнае поле. І раптам злева ад разгромленага абозу з-за куста высунулася галінка з белай хусткай.

Затым, узняўшыся ва ўвесь рост, абтрасаючы з сябе снег, усё яшчэ трымаючы ў левай руцэ галінку, да нас накіраваўся падцягнуты афіцэр з пагонамі нямецкага капітана. Ён цвёрдым крокам падыйшоў да камандзіра і далажыў:

— Капітан медыцынскай службы Поль Мейо! Вядзіце ў штаб, там буду гаварыць усё. Я—француз, саюзнік Расіі.

Вечарам у зямлянцы сакратара падпольнага абкома партыі Поль расказваў аб сабе. Ён урач-хірург, вядомы ў Францыі спартсмен, стралок з пісталета. Меў калекцыю прыватнай зброі. Калі бошы выдалі загад здаць зброю, ён не выканаў гэтага загаду.

У пакаранне яго накіравалі на Усходні фронт.

— А па дарозе нас сустрэлі вашы хлопцы. Я прыйшоў не ў палон да працаўніка, а да сваіх сяброў, да саюзнікаў. Хачу працаваць у вашым шпіталі, а калі давяраеце, дайце зброю, стралок я выдатны, хірург вопытны. Сяброў буду лячыць, а ворагаў калечыць.

Праз некалькі дзён у ложу магілёўскага тэатра ўвайшла пара, якая звярнула на сябе ўвагу: малады капітан нямецкай арміі і прыгожая, нафарбаваная, добра апранутая бялявая жанчына. Яны свабодна размаўлялі па-нямецку. І ніхто не падазраваў, што малады гауптман—гэта партызан - француз Поль Мейо, а яго размаляваная «фрау»—наша смелая разведчыца Жэня.

Гаварлівая і прывабная Жэня, а для ворагаў Клара, хутка завязвала знаёмствы з нямецкімі афіцэрамі, «бесклапотна» весялілася. Пасля спектакля, кінасеанса або рэстаранная папойкі Поль і Жэня звычайна вярталіся ў кампаніі аднаго або двух афіцэраў з ліку прыхільнікаў такой мілай фрау. У цілім месцы раздаваўся прыглушаны трэск пісталета-бясшумкі, а раніцай немцы падбіралі сваіх забітых афіцэраў.

Поль Мейо і наша разведчыца хадзілі ў Магілёў часта і заўсёды вярталіся ў лес з багатымі разведвальнымі данымі. Поль не шкадаваў марак на рэстаранныя папойкі з афіцэрамі і не меў недахопу ў сабутыльніках. За п'янкай развязваюцца языкі, пачынаюцца размовы ўпаўголаса, размовы «паміж намі», і нашы разведчыкі ведалі ўсё, што ведалі афіцэры гарнізона.

Штабу Другога Беларускага фронту патрэбны былі планы нямецкіх умацаванняў вакол Магілёва. Атрымаўшы заданне, Поль выйшаў у раён абарончых збудаванняў. На сваю бяду, там ён не сустрэў ніводнага са сваіх сабутыльнікаў. Часці былі зменены. Поля затрымалі. Знойдзеная пры вобыску запісная кніжка не выклікала сумнення ў характары дзейнасці яе гаспадара.

Двое сутак катавалі фашысты адважнага француза і нічога не дабіліся. Чэрвеньскім вечарам 1944 года смелага разведчыка расстралялі.

Так змагаўся і так загінуў на нашай Магілёўшчыне французскі патрыёт, беларускі партызан Поль Мейо.

**І. КРЫСКАВЕЦ,**
**партызан Айчыннай вайны.**

# Указ сыну

Варвару Маісееўну Саўчук мы засталі на сваім агародзе. Яна абрадавалася нам, запрасіла ў дом.

На сценах мноства фатаграфій сыноў, нявестак, унукаў, далёкіх і блізкіх сваякоў.

— Вось мой малодшы сын Грыша з жонкай Аннай і дачкой Ніначкай. Ён жыве ў Магнітагорску, працуе на заводзе. Жонка ў яго цудоўная жанчына. Я двойчы ездзіла да іх у госці. Жывуць добра. Кватэра светлая, з газам, ваннай. Клічуць да сябе, але неяк не хочацца пакідаць родныя месцы, — расказвае Варвара Маісееўна.

— А што піша Іван з Філадэльфіі?—пытаем мы.

— Кліча да сябе. Па Радзіме сумуе, усё распытвае аб нашым жыцці-быцці.

— Забралі фашысты-паганцы маладога хлопца ў Нямеччыну ў сакавіку 1943 года. Яму тады было ўсяго 18 год. Многа тады з сяла вывезлі ў рабства моладзі. Разам з ім забралі Міхаіла Радковіча, Мікалая Астапчука, Яфіма Сабчука... Амаль усе вярнуліся, а Вані не было. Толькі ў 1959 годзе атрымалі ад Вані пісьмо з Амерыкі.

Больш трынаццаці год не было звестак. Ён нічога не ведаў аб нашым жыцці. Бацьку і брату Паўлу прывітанне шле, а іх даўно ў жывых няма, з вайны не вярнуліся.

Варвара Маісееўна дыктуе пісьмо да сына:

Дарагі сыночак. Сэрца маці вельмі сумуе па табе. Як бы я хацела хоць адным вокам паглядзець на цябе, на тваю жонку, унучку Лізачку. Радуюся, што сям'я твая павялічылася, нарадзіўся сынок Яўгеній.

Калі б ты прыехаў у сваю родную вёску, ты не пазнаў бы яе. Колькі ў нас цяпер новых прыгожых дамоў. У вёсцы ёсць бальніца, амбулаторыя, радзільны дом. Не ведаю, як у вас, а ў нас лечаць бясплатна.

Раней на ўсю вёску была адна пачатковая школа. Цяпер ёсць сярэдняя школа, на ўскраіне ў Травах—пачатковая. У вёсцы тры магазіны, камбінат бытавога абслугоўвання, радыё, электрычнасць.

Змянілася вёска, змяніліся і людзі. Усе дружна працуюць, дапамагаюць адзін аднаму. У мінулым годзе захварэла я. Мяне паклалі ў бальніцу. Пакуль я хварэла, суседзі мае глядзелі за домам, кармілі карову і парсючка.

Ты пытаеш мяне, як жыве Іван Арсенцьевіч Дзехцярук. Вы разам з ім вучыліся. Ён працуе загадчыкам пачатковай школы, вучыўся завочна ў педінстытуце. У гэтым годзе здаў дзяржаўныя экзамены. Цяпер у яго вышэйшая адукацыя. Ці вучыўся ты, Іван?

У гэтым годзе ўся Беларусь адзначала вялікае свята—дваццацігоддзе вызвалення нашай зямлі ад фашысцкіх акупантаў. За гэтыя 20 год сталі прыгажэйшымі нашы вёскі і раённы цэнтр горад Кобрын. А якія цудоўныя выраслі людзі!

Сын Грыша з жонкай прыязджалі да мяне ў госці. Просяць, каб я паехала ў Магнітагорск. Цяжка мне ад'язджаць, не хочацца. Ты памятаеш наш дом і каля яго тры бярозкі? Побач з імі ты сваімі рукамі пасадзіў маленькую. Яна цяпер ужо вырасла роўна з тымі, весела шуміць зялёнай ліствою і чакае цябе. А вяз высокі пачаў сохнуць. Побач другі, пасаджаны бацькам у гонар нараджэння сына Грышы. Ён зялёны, высокі і галінасты. Прыязджай, паглядзі на ўсё гэта.

*М. ЛАЧЫМАЎ.*

Брэсцкая вобл., вёска П... лавіцце.

Лев ЩЕГЛОВ

Таможенник долго накручивал ус
И грыз карандаш в досаде:
Зачем везет необычный груз
Этот угрюмый дядя?
Груз не вошел ни в один устав,
Нет его в списке пошлин...
Махнул рукой, от раздумий устав,
Пускай разберутся в Польше!
А в Польше тоже крутили ус
И груз проверяли на цвет и на вкус.

Но пересек полдесятка стран
Путник с лицом усталым,
Как крест, на спине пронеся чемодан
С грузом своим небывалым.
Вернулся из дальнего вояжа,
Не смыв дорожную грязь,
Явился, не сдав никому багажа
В таверну на Монпарнас.

В таверне с утра дожидались его.
Сквозь сизый табачный туман
Прошел он к столу, не сказав ничего,
И выставил чемодан.
Со звоном открылись четыре замка.
Откинулась крышка со стуком.
И вот за рукой потянулась рука,
Сошлись торопливые руки.
Веселый трактирщик мосье дю Ляля
Дивился, гостей осуждая:
Была в чемодане простая земля,
Всего лишь земля простая.

Но шли к чемодану за гостем гость,
Земля расходилась за горстью горсть.
Дрожали морщины
Обветренных щек—
Седые мужчины
Сморкались в платок.
Склонялись, лицом припадая к земле,
На землю слеза бежала.
...В таверне чужой на пропитом столе
Родная земля лежала.
С отцовских погостов,
С родимых полей,
С проселков в летучей пыли...
Не будет и нет ничего на Земле
Дороже самой земли.

# СІЛІТОУ АБ САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Шчыра кажучы, за сем год у Маскве я прывык коса глядзець на артыкулы і кнігі аб Савецкім Саюзе, напісаныя людзьмі, якія прыязджаюць сюды ў пачатку месяца і ад'язджаюць у канцы, а бывае і раней.

І заўсёды атрымлівалася так, што чым менш яны тут знаходзяцца, і чым больш яны выяўляюць невуцтва, тым больш апломбу ў іх папярэдне напісаных меркаваннях. Некалькі з самых «глыбокіх» даследаванняў былі напісаны некаторымі англійскімі журналістамі, якія правялі цэлых дзве гадзіны ў маскоўскім аэрапорце ў час адной з такіх пазнавальных перасадак.

Ва ўсякім выпадку, гэта не проста палітыка—з гэтым цалкам можна не згадзіцца, калі прытрымлівацца правіл прыстойнасці. Гэта толькі гладкая, пышная, бязмежная самазадаволенасць і самая сапраўдная абмежаванасць тых, хто лічыў сябе такім свядомым у галіне слова, такім свядомым, што вельмі хутка надакучыў.

Такім чынам, я павінен прызнацца, што іменна з некаторым трапятаннем я ўзяўся за «Дарогу ў Волгаград», кнігу Алана Сілітоу аб месячным знаходжанні ў Савецкім Саюзе мінулай вясной. Але я дарэмна непакоіўся. Нічога слізкага, павярхоўнага не аказалася ў аўтара «У суботу вечарам і ў панядзелак раніцай», «Ключ ад дзвярэй» і інш. Ён бліжэй усіх падыйшоў да цэнтра ўспрыняцця рэчаіснасці.

У асноўным яго турнэ па Саюзу прыходзіцца на Маскву і Волгаград.

Я быў у Ленінградзе, Іркуцку, Брацку, дзе велізарная новая плаціна ў сэрцы Сібіры дапамагае змяняць карту як геаграфічна, так і індустрыяльна, карту тэрыторыі, якая змясціла б Францыю, Галандыю і Бельгію.

Я быў там усюды і магу сказаць, што Сілітоу ўхапіў самае галоўнае. Лепш, чым якая-небудзь кніга, якую я чытаў, «Дарога ў Волгаград» перадае дух жыцця «ў краіне, глыбока жывой і чалавечнай, і ўяўляе найбольшую цікавасць у тым, што яе сацыяльны лад адрозніваецца ад другіх краін».

Гэта нешта больш, чым проста апавяданне падарожніка. Гэта не «палітычная» кніга ў агульнапрынятым сэнсе слова.

Сілітоу ўмела ўхапіў і ярка перадае некаторыя асноўныя факты аб тым, аб чым думае савецкі чалавек на вуліцы, напрыклад, аб такіх рэчах, як Германія — «вулкан у цэнтры Еўропы, гатовы ўзарвацца ў любы момант».

У кнізе аўтар неаднаразова звяртаецца да ваеннай тэмы ў час паездкі па Савецкім Саюзе. У гэтай сувязі аўтар успамінае вечар, праведзены з Канстанцінам Сіманавым, аўтарам вядомых кніг аб другой сусветнай вайне. А яшчэ колькі такіх кніг з'явіцца з-пад пяра савецкага пісьменніка!

Сіманаў расказаў яму, як ён вынайшаў 250 імён, воінскіх званняў і цывільных прафесій для сваіх персанажаў. Прычым, большасць з іх упаміналася толькі мімаходам.

І тым не менш, Сіманаў атрымаў тысячы пісем, у якіх просяць паведаміць больш падрабязна аб гібелі мужоў, сыноў і братоў.

Аб масквічах, якіх ён бачыў на Краснай плошчы Першага мая, Сілітоу піша: «Яны ведаюць, чаго яны дасягнулі як савецкія людзі і якой цаной. Кожная пара чаравікаў, капялюш, заколка, кожная цацка—усё гэта выстаўлялася ў вітрынах, ля ўваходаў на фабрыкі.

Усё, што вы купляеце ў Расіі, здабыта дарагой цаной, але з вас, як з іншаземца, яны за гэта дорага не возьмуць. За астатняе яны ўжо заплацілі нейкім чынам. Я бачыў іх усіх: і кваліфікаваных рабочых, і працаўнікоў, і жанчын, якія будуюць дарогі, і тых, хто будуе дамы, і бетоншчыкаў — упартых, вынослівых, інтэлігентных, нязломных рускіх, з якімі мы павінны яшчэ бліжэй пазнаёміцца».

Ён палемізаваў з савецкімі калегамі па пяру аб мастацтве, літаратуры, і асабліва аб крытыцы маладога паэта Еўтушэнкі за тое, што ён апублікаваў сваю аўтабіяграфію ў парыжскім часопісе.

У ёй былі свае недахопы, якія сапраўды трэба было крытыкаваць. Але для некаторых крытыкаў Еўтушэнка і яго мемуары, як і мадэрнісцкае мастацтва, з'явіліся толькі адгаворкай.

Сілітоу, які недастаткова крытычны ва ўсім, мяркуе, што Еўтушэнку павінны пакінуць у спакоі.

Ён таксама дае з усёй шчырасцю зразумець, што не збіраецца звязвацца з тымі заходнімі «добразычліўцамі» савецкай літаратуры, якія нажываюць капітал на «халоднай вайне», выкарыстоўваючы любую дыскусію або палеміку. Гэта сардэчная кніга, шчырая і гуманная. Вы павінны прачытаць яе.

**Дэніс ОГДЭН,**
**англійскі журналіст.**

НА ЗДЫМКУ: камандныя спаборніцтвы Савецкага Саюза па веласпорту, якія днямі закончыліся ў Мінску.

# Sillitoe on the Soviet Union

*ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ НАШЫХ СУАЙЧЫННІКАЎ*

To be frank, during seven years in Moscow I came to look a bit askance at articles and books about the Soviet Union written by people who flew in at the beginning of the month and out at the end — if not sooner.

The shorter their stay and the greater their ignorance, it nearly always seemed, the greater the aplomb with which they presented their pre-cooked conclusions. Some of the most "profound" were written by some British journalists who spent the whole of two hours at Moscow Airport when they flew in and out again on one of those inaugural flight junkets.

It was'nt just the politics — after all, it's possible to disagree while still preserving the decencies. It was the slick, flashy superficialitty, the unbounded conceit and the essential parochialism of those who thought themselves so worldly-wise, so infinitely knowledgeable that became so tedious.

So I must confess that it was with some trepidation that I approached Road to Volgograd (W. H. Allen, 18s), Alan Sillitoe's account of a one-month visit to the Soviet Union in spring last year.

I need not have worried. I should have known better. There's nothing slick, flashy, superficial or parochial about the author of "Saturday Night and Sunday Morning," "The Loneliness of the Long-Distance Runner" or "The Key to the Door." He had got nearer to the hub of things than most.

His Soviet tour took in Moscow and Volgograd.

It took in Leningrad, Irkutsk and Bratsk, where a great new dam in the heart of Siberia is helping to change the map, both geographically and industrially, of an area as big as France, Holland and Belgium put together.

I have been to them all, and I can say that Sillitoe has captured their spirit. Better than any other book I have read. "Road to Volgograd" conveys the flavour of life in "a country which is deeply alive and human, and more interesting than most in that its social organisation is different."

It is something more than just another traveller's tale. On the other hand, it is not a "political" book in the generally accepted sense of the word.

Sillitoe has grasped and eloquently conveys some basic facts about the way the Soviet man in the street thinks about things — such things, for example, as Germany, "a volcano in the middle of Europe, liable to erupt every 20 years or so."

The theme of war and what it meant is constantly recurring, in the book, as it is in day-to-day Soviet contacts. Sillitoe recalls an evening with Konstantin Simonov, author of the most significant World War II novels yet to come from the pen of a Soviet author.

Simonov told him how he had invented 250 names, ranks and civilian occupations for his characters. Most were mentioned only briefly.

But Simonov had received thousands of letters asking for more information about the deaths of husbands, sons and brothers.

Of the Muscovites he watched in Red Square on May Day, Sillitoe writes: "They knew what they had achieved as Soviet people, and at what cost. Every pair of shoes, hat, hairpin, every piece of priceless functioning mechanism, had been put in shopwindow or bolted to the factory base at a cost bigher than just work.

"Everything yon buy in Russia has cost blood, but they only ask you for rouble notes in exchange, as a foreigner. The Russians have already paid that part of the price, somehow or other.

"I see them all: the skilled men, the hard workers, the women who repair roads, those who make houses, dig, mix concrete; tough, intelligent, unkillable Russians whom we must get to know."

With Soviet fellow-writers he discussed current controversies about art and literature, in particular the attacks on the young poet Yevtushenko following the publication of his autobiography in a Paris journal.

It had its schortcomings which could legitimately be criticised. But for some of the critics Yevtushenko and his memoirs were, like modern art, but a stalking horse.

Sillitoe, who takes a poor view of critics everywhere, thinks they should have left Yevtushenko alone.

He also makes it very clear that he has no time at all for those Western "well-wishers" of Soviet literature who are out to make cold-war capital out of any discussion or controversy.

This is a warm-hearted book, an intensely human and sincere book. It is a book you must read.

*Dennis Ogden.*

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.

НАШ АДРАС
Мінск, Ленінскі праспект, 77,
Дом друку.
Рэдакцыя газеты «Голас Радзімы».